

**Новыя месцы ствараюць прыватнікі**

СТАР. 5



**Хто працуе з ісцінай?**

СТАР. 7



**Навацыі фармацэўтыкі**

СТАР. 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

25 МАЯ 2016 г. СЕРАДА № 97 (28207) Кошт 2400 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ ДЗЯРЖАВЫ І ДАБРАБЫТ ЛЮДЗЕЙ

## Такіх прынцыпаў павінны прытрымлівацца прэтэндэнты на месцы ў парламенце

**Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па арганізацыі працы па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання.**

Прэзідэнт даручыў выпрацаваць шэраг крытэрыяў, пры адпаведнасці якім дзяржава будзе падтрымліваць кандыдатаў незалежна ад іх палітычных пераваг. «Трэба на такіх кандыдатаў рабіць стаўку. Калі ім будзе патрэбна падтрымка — значыць, трэба іх падтрымаць. Усё роўна, да якіх палітычных плыняў яны будуць належаць. Галоўнае, каб гэта былі сумленныя і прыстойныя людзі», — перакананы Аляксандр Лукашэнка.

Чакаецца, што будзе выпрацавана каля дзясятка прынцыпаў. «Ніхто не стане аспрэчваць, што адным з крытэрыяў будучага кандыдата ў парламент павінна быць пытанне незалежнасці нашай дзяржавы», — растлумачыў Прэзідэнт. Яшчэ адным з крытэрыяў стане імкненне павышаць дабрабыт людзей без правядзення незразумелых радыкальных шокавых рэформаў на шкоду насельніцтву, дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт запатрабаваў, каб парламенцкая кампанія ў краіне прайшла арганізавана і спакойна, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка таксама выказаў свой пункт гледжання з нагоды асвятлення выбарчай кампаніі: «Сакрэтаў ніякіх ні ад кога быць не павінна». На думку кіраўніка дзяржавы, неабходна, каб у СМІ гучала больш інфармацыі пра тое, што зроблена ў Беларусі ў плане выканання міжнародных рэкамендацый, укаранення прынятых у свеце дэмакратычных стандартаў.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што «заканадаўства Беларусі адпавядае міжнародным прынцыпам, улічвае правілы, якія склаліся ў краіне, традыцыі правядзення выбараў». «Мы ўспрымаем гэта як належнае і, адпаведна, памоўчваем часам. Аднак сціпласці тут быць не павінна. Пра гэта трэба гаварыць», — перакананы Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што, згодна з заканадаўствам, дата выбараў павінна быць аб'яўлена не пазней за 10 чэрвеня, і падкрэсліў, што адпаведныя рашэнні будуць прыняты своечасова.

■ Парламенцкі дзённік

# КЛЮЧАВОЕ ПЫТАННЕ — ПАШЫРЭННЕ ЭКАНАМІЧНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

## Такое меркаванне выказаў старшыня Савета Рэспублікі

**Спікеры верхняй і ніжняй палат Нацыянальнага сходу нашай краіны Міхаіл Мясніковіч і Уладзімір Андрэйчанка сустрэліся з першым намеснікам старшыні Дзяржаўнага Савета і Савета Міністраў Кубы Мігелем Марыа Дыяс-Канелем Бермудэсам.**

Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што сумесных эканамічных праектаў «відавочна недастаткова». Галоўныя прычыны, якія стрымліваюць развіццё супрацоўніцтва, — гэта праблемы плацежаздольнасці прадпрыемстваў Кубы і дэфіцыт плацежнага балансу Беларусі. Старшыня Савета Рэспублікі бачыць выйсце з гэтага становішча ў сумесным прыцягванні знешніх інвестыцый і пошуку новых фінансавых схем супрацоўніцтва. «Мы, напрыклад, імкнёмся развіваць малы і сярэдні прыватны бізнес, праводзім прыватызацыю дзяржуласнасці і працуем з партнёрамі па Еўразійскім эканамічным саюзе», — прывёў прыклад ён.

Уладзімір Андрэйчанка ў сваю чаргу адзначыў, што сёння Беларусь і Куба паспяхова ўзаемадзейнічаюць па многіх напрамках, пра якія ішла гаворка на мінулых сустрэчах. Адным з прыярытэтаў партнёрства з'яўляецца супрацоўніцтва ў сельскагаспадарчым сектары, у прыватнасці пастаўка беларускай тэхнікі на Кубу. Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў, што «курс на ўмацаванне стратэгічнага партнёрства з Кубай з'яўляецца нязменным, і важная роля ў гэтым належыць парламентарыям Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Кубы».

У той жа час абедзве краіны плённа супрацоўнічаюць у межах міжнародных арганізацый — у тым ліку ў ААН і Міжпарламенцкім саюзе. Беларусь традыцыйна падтрымлівае Рэзалюцыю ААН аб зняцці блакады Кубы, якая тычыцца неабходнасці спыніць эканамічныя санкцыі з боку ЗША. «Наша рабочая група па супрацоўніцтве з парламентам Кубы пастаянна прымае заявы па гэтым пытанні. Нам прыемна, што сёння пачаўся працэс нармалізацыі адносін паміж Рэспублікай Кубай і ЗША», — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка.

Спікер Палаты прадстаўнікоў перадаў прывітанне Эстэбану Ласа Эрнандэсу, старшыні парламента Кубы, і падзякаваў за запрашэнне наведаць гэту краіну. З-за шчыльнага графіка Уладзімір Андрэйчанка не змог ажыццявіць гэты візіт, але запэўніў, што пасля парламенцкіх выбараў усе дакументы будуць перададзены новаму сходу і пытанне візіту з парадку дня не здымаецца.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# ПАШТОВЫ ЭКІПАЖ



**Чвэрць стагоддзя Мікалай КАБЯК з вёскі Басянкі Мёрскага раёна працуе паштальёнам. Адрасы дастаўкі ў яго — адзінаццаць навакольных паселішчаў. Нярэдка бывае, што за дзень Мікалаю Аркадзевічу трэба адмахаць паўсотні кіламетраў. Паўбяды, калі на двары вясна альбо лета, а як быць зімою, у завею і моцны мароз? Таму найчасцей вясковы паштальён адпраўляецца ў дарогу на кані. Паслухмяная і жвавая Венера ўжо трынаццаць гадоў дапамагае гаспадару ў яго паштарскіх вандроўках.**

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір ПАТУПЧЫК, міністр энергетыкі Беларусі:**

*«Беларусь абсалютна адкрыта для кантактаў з міжнароднай супольнасцю пры будаўніцтве атамнай электрастанцыі ў Астраўцы, але мы супраць рознага роду спекуляцый. Мы запрашаем калег на пляцоўку, каб кожны мог на свае вочы ўбачыць ход рэалізацыі гэтага праекта, не ўтойваем нічога ад грамадскасці. Мы вельмі сур'ёзна ставімся да кожнага этапу, звязанага з будаўніцтвам АЭС, у тым ліку да пытанняў выбару пляцоўкі, з падрыхтоўкай інфраструктуры, нарматыўнай базы, кадраў, арганізацыі будаўнічага працэсу. І трэба адзначыць, што міжнародныя арганізацыі ў сферы атамнай энергетыкі пазітыўна ацэньваюць вопыт беларускага боку ў рэалізацыі праекта АЭС».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.05.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19759,00 | ▲ |
| Еўра | 22102,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 294,53 | ▲ |
| Укр. грыўня | 786,11 | ▲ |

# ПАВЕТРАНЫЯ ХЛЕБАРОБЫ

## Карэспандэнтка «Звязды» разам з лётчыкамі аграмкамбіната «Зара» папрацавала на карысць будучага ўраджаю

**Авіяцыя для сельскай гаспадаркі не таннае задавальненне, але ў агракамбінаце «Зара» Магілёўскага раёна ведаюць, што без гэтага не даб'юцца тых высокіх вынікаў, за якія звычайна ўшаноўваюць на галоўным свяце хлебаробаў «Дажынкі». Дарэчы, прадстаўнікі гэтай славутай гаспадаркі там ёсць заўсёды. Не разумею толькі, чаму сярод герояў няма Дзмітрыя Сукача і Сяргея Цімкова — лётчыкаў авіягрупы, якая ў гэтыя вясновыя дні па 40 і больш разоў з самага ранку падымаецца на Ан-2 у неба і «корміць» квітнеючыя палі гаспадаркі.**

### 50 МЕТРАЎ ПАД КРЫЛОМ

Сорамна прыгадваць, колькі было хвалявання перад палётам. Не першы раз, але лятаю не так часта. Ад гаспадаркі да невялічкага аэрадрома сярод палёў некалькі кіламетраў. Пакуль мяне вязуць туды на ўсюдыходнай «Ніве», паспяваю даведацца, што Ан-2 — самая бяспечная тэхніка, што нават калі рухавік адмовіць, самалёт проста спланіруе на поле. Пасля гэтых слоў становіцца лягчэй. Таму на месцы адразу ж пачала з таго, каб пусцілі ў самалёт. Начальнік авіягрупы Віктар Сасім не пярэчыў.

Камандзіры невялікага авіясудна Дзмітрый Сукач і Сяргей Цімкоў гасцінна запрашаюць у салон. Камфорту там, прызнаюся, мала. Замест пасажырскіх крэслаў вялікі бак, куды засыпаюцца ўгнаенні. У астатнім усё, як у звычайным самалёце. Кабіна на дваіх, шмат прыбораў. Калі лётчыкі даведваюцца, што я карэспандэнтка «Звязды», дазваляюць пасядзець нават за штурвалам. І вось гучыць каманда: «Ад вінта!».




За штурвалам Дзмітрый Сукач.

Легкакрылая машына ўздрыганулася, пранеслася некалькі метраў па невялічкай паласе і ўзляцела, павольна набіраючы вышыню. Сэрца калацілася хутчэй ад нечаканасці, чым ад страху. Хуткасць — далёка не звышгук, усяго 160 кіламетраў у гадзіну. Ды і вышыня, мякка кажучы, умоўная. Усяго 50 метраў. Ан-2 наогул можа ляцець над полем на вышыні... 5 метраў. А 50 метраў — гэта якраз тая вышыня, якая патрэбна па тэхналогіі для ўнясення ўгнаенняў.

СТАР. 3




## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Ці быў выбух на борце А320?



Кіраўнік судмедэкспертызы Егіпта Хішам Абдэль Хамід абверг інфармацыю аб выбуху на борце пацярпелага крушэнне ў Міжземным моры егіпецкага самалёта А320. «Паведамленні, якія прайшлі ў шэрагу СМІ і прыпісваліся крыніцам у судмедэкспертызе, з нагоды аналізу астанкаў пасажыраў, не адпавядаюць рэчаіснасці і не маюць пад сабой ніякіх падстаў, — заявіў ён афіцыйнаму агенцтву MENA. — Гэта толькі здагадка, якая не мае ніякага дачынення да крыміналістычнай экспертызы і экспертаў, якія там працуюць».

Пра тое, што аналіз астанкаў загінуўшых пры катастрофе паказвае на выбух на борце, паведаміла Associated Press са спасылкай на экспертаў-крыміналістаў. Пры гэтым, паводле іх слоў, сляды выбуховых рэчываў пакуль не знойдзеныя.

### Citigroup прагназуе нафту па 65 долараў



Аналітыкі міжнароднага фінансавага холдынга Citigroup прагназуюць, што сярэдні кошт барэля нафты маркі Brent павысіцца да 50 долараў у трэцім квартале 2016 года і да 65 — да канца 2017-га. Свой прагноз эксперты тлумачаць запаволеннем росту здабычы краінамі, якія не ўваходзяць у АПЕК. Акрамя таго, у бягучым годзе паўсталі сур'ёзныя перабоі з пастаўкамі з Нігерыі, Лівіі і Канады. Як адзначаецца ў дакладзе, у найбліжэйшай будучыні не прадбачыцца падстаў для зніжэння цэн. У сваім папярэднім прагнозе эксперты падкрэслівалі, што дасягненне такога ўзроўню цэн малаверагоднае да чацвёртага квартала 2016 года.

### Тысячы лятучых лісіц перашкаджаюць жыць аўстралійцам

Улады аўстралійскага Новага Паўднёвага Уэльса абвясцілі аб рэжыме надзвычайнага становішча ў партовым горадзе Бэйтменс Бэй з-за нашэсця лятучых лісіц. Для барацьбы з гэтымі жывёламі, якія харчуюцца ў асноўным кветкамі, сокам і мякаццю пладоў, урад рэгіёна выдзяляў 2,5 мільёна долараў. У горадзе і яго наваколлі зараз знаходзяцца каля 100 тысяч лятучых лісіц, вонкава падобных на кажаноў. Мясцовым жыхарам яны сур'ёзна перашкаджаюць, бо гэтых жывёл суправаджае пастаянны шум і дрэнны пах, абставіны сапраўды даводзяць сітуацыю «да надзвычайнага становішча». Пакуль улады яшчэ не прынялі рашэння аб тым, якім спосабам прагнаць жывёл. Як мяркуюць біёлагі, рукакрылых прыцягваюць пахі кветак, якія растуць у ваколіцах горада. Яны таксама адзначаюць, што гэтыя жывёлы адыгрываюць важную ролю ў распаўсюджанні насення раслін.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Фізічная актыўнасць зніжае рызыку 13 відаў раку

Даследчыкі з Нацыянальнага інстытута анкалогіі ў ЗША прааналізавалі даныя аб фізічнай актыўнасці 12 груп добраахвотнікаў з Еўропы і ЗША. Затым яны супаставілі гэтыя даныя з распаўсюджанасцю 26 відаў раку. За 11 гадоў сярод 1,4 мільёна ўдзельнікаў было выяўлена 186 932 выпадкі раку.

Навукоўцы выявілі: высокі ўзровень фізічнай актыўнасці змяншаў верагоднасць 13 з 26 відаў раку. Так, дзякуючы яму зніжалася рызыка адэнакарцыномы стрававода (на 42%), раку печані (на 27%), лёгкіх (на 26%), нырак (на 23%), кардыяльнага аддзела страўніка (на 22%). Акрамя таго, верагоднасць міелаіднага лейкозу памяншалася на 20%, міеломы — на 17%, раку тоўстай кішкі — на 16%, галавы і шыі — на 15%, прамой кішкі — на 13%, малочнай залозы — на 10%.

У цэлым фізічная актыўнасць зніжала рызыку раку на 7%.

КОРАТКА

**Двухразовая алімпійская чэмпіёнка Кацярына Карстэн атрымала права выступіць на сёмай Алімпіядзе запар. Упершыню ўраджэнка Крупскага раёна выступіла на Алімпіядзе ў 1992 годзе ў Барселоне, дзе стала бронзавым прызёрам у чацвёрцы парнай.**

Міністэрства фінансаў назвала топ-10 прыбытковых адкрытых акцыянерных таварыстваў Беларусі за 2015 год. Узначаліў спіс «Беларуськалій» (Br11,26 трлн), у тройцы знаходзяцца «Газпрам трансгаз Беларусь» (Br4,9 трлн) і Мазырскі НПЗ (Br3,5 трлн).

**Міністэрства гандлю Беларусі дазволіла магазінам і кафэ не працаваць у ноч на 1 ліпеня ў сувязі з дэнамінацыяй.**

Сумесны беларуска-кітайскі навукова-тэхнічны інстытут «Чжун Сінь» адкрыўся ўчора ў Мінску. Цырымонія сімвалічнага адкрыцця адбылася ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі падчас візіту дэлегацыі правінцыі Шаньдун (КНР) на чале з віцэ-губернатарам Ван Шуцзянам.

■ Рынак працы

# ПАТРАБУЮЦЦА ПРАДАЎЦЫ... МЕТАЛАПРАКАТУ

## Каму абяцаюць заробак у 100 мільёнаў?

**Ці рэальна за месяц зарабіць на падарожжа па Паўднёвай Афрыцы, а за год — на новую кватэру ў сталіцы? Для сярэднестатыстычнага беларуса з заработнай платай у сем мільёнаў (такія лічбы прыводзіць Белстат) сумы, бадай, фантастычныя. Але на біржы працы часам з'яўляюцца вакансіі з прапановамі пад сто мільёнаў. «Звязда» высветліла, каму са спецыялістаў гатовы столькі плаціць і якія навыкі неабходны, каб заняць гэтыя пасады.**

### Айцішнік з веданнем фітнесу

Частка прывабных прапаноў — для праграмістаў. Так, дырэктара па тэхнічных пытаннях шукае міжнародная кампанія, якая распрацоўвае рашэнні па кіраванні тэлекамунікацыйнымі аперацыямі. За месяц абяцаюць 85 мільёнаў рублёў. Але, зразумела, не кожны, хто адвучыўся на айцішніка, можа разлічваць на гэтыя грошы. З патрабаванняў наймальніка — свабодная англійская і ўкраінская мовы і вопыт, не меншы за пяць гадоў. Год таму, дарэчы, на гэтае месца ўжо шукалі чалавека. Але той, як бачым, не затрымаўся. Ці то работнік з абавязкамі не справіўся, ці то заробак для такой пасады недацягвае.

Спецыяліста па камп'ютарнай графіцы за 89 мільёнаў запрашаў мінскі офіс амерыканскай кампаніі.

— Для ІТ-сферы гэта стандартная вакансія, — здзівіліся нашаму інтарэсу ў фірме і прызналіся, што работніка, які іх цалкам задаволіў, ужо знайшлі.

Патрабаванняў, між іншым, было шмат: больш за дзевяць гадоў вопыту інтэрактыўнага дызайну для сайтаў і прылад, добрае валоданне англійскай мовай і... глыбокія веды ў галіне фітнесу. Апошняя ўмова не капрыз наймальніка: дызайнер цяпер працуе над праграмай, якая дапамагае весці здаровы лад жыцця.

Для спецыялістаў, не звязаных з ІТ-індустрыяй, прывабныя прапановы таксама ёсць. Дзве вакансіі з рэкорднымі заробкамі адкрыты ў прадстаўніцтве турэцкай кампаніі, якая займаецца авіяперавозкамі. 99 мільёнаў за месяц гатовы плаціць бухгалтару і начальніку аддзела браніравання і продажаў. На вакансіі адгукнуліся з дзясятак чалавек, але месцы дагэтуль не заняты. З неабходнага — вопыт працы ад 10 гадоў у авіякампаніі (у тым ліку і ў замежных прадстаўніцтвах ад пяці гадоў), добрая турэцкая мова, веданне сістэмы браніравання і продажу квіткоў. Бухгалтар у дадатак да ўсяго павінен быць знаёмым з асаблівасцямі бухуліку Турцыі. Як патлумачылі кадравікі кампаніі, гэта патрэбна для замежных камандзіровак.

СТАР. 2

# СПАДЧЫНА СЛУЖЫЦЬ НАШЧАДКАМ

## Шэраг музеяў на месцы гістарычных аб'ектаў адкрылі за пяцігодку на Брэстчыне

V Усебеларускі народны сход

**Часцей за ўсё пра адраджэнне гістарычнай спадчыны гавораць у сувязі з развіццём турызму. І гэта зразумела. Гасцям трэба паказаць нешта цікавае, запамінальнае, каб прыцягнуць іх увагу і грошы. Аб'екты, якія атрымалі апошнім часам другое жыццё, з названай задачай спраўляюцца. Але ж мы адраджаем былыя палацы, сядзібы і фальваркі не толькі для гасцей, а найперш для сябе. Каб ведаць сваё мінулае, заахвочваць дзяцей вучыць і шанаваць гісторыю роднай зямлі. І на гэтым шляху Брэстчына зрабіла нямала, пачынаючы з нулявых гадоў і асабліва за апошнюю пяцігодку.**

Ёсць нагода ганарыцца той часткай **палацавага комплексу Сапегаў у Ружанах**, якая паўстала фактычна з руін. Ружанскі замак, так яго да гэтай пары называюць месцічы, заклаў канцлер Вялікага Княства Літоўскага Леў Сапега ў 1596 годзе. Праз сто гадоў замак быў цалкам разрабаваны і спалены падчас вайны са шведамі. У XVIII стагоддзі яго перабудавалі. Архітэктар Ян Самуэль Бекер узвёў палац такім, якім яго захавалі даўнія карціны і гравюры. Але ў 1831 годзе за падтрымку вызваленчага паўстання расійскі імператар канфіскаваў палац у Сапегаў. Унікальную бібліятэку, якая налічвала больш за 4,5 тысячы кніг на 10 мовах, вывезлі ў Маскву. Разбурэнне ружанскага Версаля працягвалі Першая і Другая сусветныя войны. Былы палац зеўраў руінамі, яго тэрыторыя служыла пашай для коз і авечак.

Рэстаўрацыйныя работы ў Ружанах пачаліся ў 2008 годзе. А ў студзені 2011 года афіцыйна адкрыўся музей «Ружанскі палацавы комплекс Сапегаў». Сёння музей складаецца з чатырох экспазіцыйных і выставачнай залы, якія ўвесь час папаўняюцца экспанатамі.

Работы па рэстаўрацыі працягваюцца і будуць весціся яшчэ доўга. Адноўлена частка паўднёвага корпуса — абодва флігелі і ўязная брама. Распачата рэстаўрацыя ўсходняга корпуса. Раней тут былі манеж, княжацкая канцылярыя, тэатр, у якім працавалі каля ста акцёраў і музыкантаў. Тэатр меў сем куліс, цягам адной пастаноўкі можна было памяняць некалькі дэкарацый. Паводле плана рэканструкцыі ўсходняга корпуса, тэатр у стылі XVIII стагоддзя мяркуецца захаваць. З'явяцца таксама новыя экспазіцыйныя залы.

У цяперашнім музеі знайшлі сваё месца археалагічныя знаходкі — пячная кафля, прадметы посуду, нават гузік з ініцыяламі Аляксандра Сапегі. Копія пліты ў гонар візіту ў Ружаны караля Рэчы Паспалітай і вялікага князя літоўскага Уладзіслава IV Вазы з жонкай Цэцыліяй Рэнатай Аўстрыйскай — асаблівы экспанат. Цікавы элемент экспазіцыі — адрэстаўраваны драўляны герб, які вісеў на ўязной браме з 1772-га да 2008 года. Цяпер ён займае адну са сцен залы. Прадметам гонару музейных работнікаў, несумненна, з'яўляецца віртуальная Сапегіяна. Лічбавы варыянт вялікай часткі бібліятэкі з'явіўся стараннямі бібліятэчных работнікаў Беларусі, Польшчы, Расіі, Літвы. Гэты міжнародны праект прэзентавалі на адным са свят «Ружанская брама», якія паступова ўваходзяць у традыцыю гарадскога пасёлка.

Дырэктар музея Руслан Кніга гаворыць, што кожны год музейны комплекс наведваюць каля 20 тысяч чалавек. Можа, не вельмі шмат у параўнанні з тым, які паток наведвальнікаў прымаюць іншыя аб'екты, але ж гэта толькі пачатак, і рэканструкцыя палацавага комплексу працягваецца. З часам у Ружанах плануюць прымаць болей турыстаў і праводзіць больш мерапрыемстваў.



Адноўленая частка палацавага комплексу Сапегаў у Ружанах.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Хутка заваяваў вядомасць яшчэ адзін знакавы гістарычны будынак Брэстчыны — **сядзібна-паркавы комплекс Нямцэвічаў**. Ён знаходзіцца ў Скоках, гэта зусім побач з абласным цэнтрам. Найбольш вядомы прадстаўнік роду Нямцэвічаў — пісьменнік, публіцыст, дзяржаўны дзеяч, ад'ютант Тадэвуша Касцюшкі, адзін з аўтараў першай канстытуцыі ў Еўропе Юльян Урсын Нямцэвіч (1757–1841).

Скокаўскі палац найперш вядомы падпісаннем пратакола аб ваенным перамір'і паміж Савецкай Расіяй і Германскай імперыяй 15 снежня 1917 года. Тым самым была фактычна спынена Першая сусветная вайна. Сам жа палац быў тады рэзідэнцыяй прынца баварскага Леапольда. Тут рыхтаваўся Брэсцкі мір, які крыху пазней падпісалі на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці.

Сядзіба Нямцэвічаў многа бачыла на сваім вяку і шмат што перажыла. Двойчы была цалкам разрабаваная. Яе планавалі ўзарваць, маглі проста разабраць на цэглу, але яна ацалела. І ў пэўным сэнсе будынку пашанцавала, бо тут з сярэдзіны 1940-х да сярэдзіны 1980-х гадоў знаходзілася школа. Потым некалькі гадоў былы палац перажываў запусценне. І ў 2006 годзе пачаліся работы па яго рэстаўрацыі. У снежні 2013 года першых наведвальнікаў прыняў гісторыка-мемарыяльны музей. На першым паверсе госці могуць пазнаёміцца з пакоем Юліяна Нямцэвіча. Тут размешчаны дзве залы — землеўпарадкавання і роду Нямцэвічаў. На другім паверсе аформлены парадная зала, музычна-мастацкі салон, скарбніца, збройны пакой. У выставачнай зале экспануюцца карціны з выявамі помнікаў архітэктуры Брэсцкага раёна. Названыя работы майстры падарылі музею пасля свайго пленэру, прымеркаванага да адкрыцця музея.

Скокаўскі музей праводзіць вялікую асветніцкую работу па тэматыцы Першай сусветнай вайны. Увайшлі ў традыцыю навукова-практычныя канферэнцыі, тэматычныя выставы. Праводзяцца рэканструкцыі падзей стагадовай даўніны, на якія збіраюцца аматары гісторыі з многіх краін свету.

Працягваецца маштабная рэканструкцыя **палаца графаў Пуслоўскіх у Івацэвіцкім раёне**. Ужо сёння комплекс наведваюць і агледаюць звонку шматлікія турысты, якія заязджаюць у дом-музей Тадэвуша Касцюшкі. Названы дом быў створаны раней на месцы радавой сядзібы Касцюшкаў. А ў 2008 годзе пачаліся работы па адраджэнні велічнага палаца, які некалі называлі «рыцарскай мрояй». Будынак складаўся з цэнтральнага двухпавярховага корпуса і двух бакавых крылаў. З-за гранёных зубчастых вежаў яго нярэдка называлі яшчэ мініяцюрным замкам. 12 вежаў сімвалізавалі месяцы года. У палацы было 132 пакоі і раскошныя залы. Яго акружалі ўнікальны парк і гонар гаспадароў — аранжарэя.

Помнік гісторыка-культурнай спадчыны быў унесены ў Дзяржаўную інвестыцыйную праграму і атрымаў рэспубліканскае фінансаванне. І вось ужо паўсталі сцены з вежамі ў ранейшай прыгажосці. Работы вядуцца ўсярэдзіне. На шчасце, такіх прыкладаў па вобласці можна прывесці нямала. У справе адраджэння гістарычных помнікаў, акрамя дзяржаўных сродкаў, задзейнічаны і прыватная ініцыятыва, і грошы грамадскіх арганізацый, і замежныя інвестыцыі. Добра, што паўстае з нябыту вельмі прыгожы **Воўчынскі касцёл** — культавае збудаванне на радзіме князёў Чартарыйскіх і іх нашчадка, апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Не развальваецца сядзіба Бохвіцаў у Ляхавіцкім раёне, звязаная з імем Элізы Ажэшкі. Многія цікавыя, славутыя, прыгожыя, значныя аб'екты чакаюць сваёй чаргі і, трэба спадзявацца, дачакаюцца.

Як паведаміў **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Брэсцкага аблвыканкама Аляксандр МУРАШКІН**, прынята рашэнне навукова-метадычнага савета па ахове гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры аб мэтазгоднасці надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці ў рэгіёне 11 матэрыяльным нерухомым, двум рухомым і шасці нематэрыяльным аб'ектам. Аляксандр Мурашкін таксама адзначыў, што нямала зроблена на гэтым шляху з прыцягненнем пазабюджэтных сродкаў. Напрыклад, **новы будынак музея Напалеона Орды ў вёсцы Варацэвічы Іванаўскага раёна** ўзведзены за кошт замежных грантаў, ён уступіў у строй летась. Удалося прыцягнуць сродкі і на рэстаўрацыю **Крыжаўздзвіжанскай царквы ў вёсцы Вістычы Брэсцкага раёна.** Памянялі гаспадароў палац у Паланечцы і сядзіба ў Ястрамблі Баранавіцкага раёна, палац у Высокім Камянецкага раёна. Распачата работа па кансервацыі на капліцах у Дубаі Пінскага і Моладаве Іванаўскага раёнаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

---

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**27 мая 2016 года ў 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца пасяджэнне адзінаццатай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.**

---

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## У СОМА — ЧАС СПАКОЮ

**У найбуйнейшага насельніка беларускіх вадаёмаў — сома — пачаўся нераст. Сом адкладае ікру пазней за асноўную масу рыб, калі вада добра прагрэецца.**

— Згодна з Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, забарона на вылаў сома ўстанаўліваецца двойчы на год. У вясенне-летні перыяд ён дыферэнцаваны па рэгіёнах. У паўднёвых абласцях краіны (Брэсцкай і Гомельскай) абмежаванні ўжо пачалі дзейнічаць з 19 мая і працягнуцца да 20 чэрвеня. На астатняй тэрыторыі забарона будзе ўстаноўлена з 31 мая па 1 ліпеня, — паведаміла **прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга ГРАМОВІЧ**.

Сом — не толькі важная прамысловая рыба, але і «моцнае» звяно ў харчовым ланцужку вадаёма: ён спажывае хворую і мёртвую рыбу, падтрымліваючы тым самым чысціню воднага асяроддзя. У той жа час сом застаецца прывабным трафеем для браканьераў, якія для яго вылаву выкарыстоўваюць не толькі забароненыя прылады, але і выбуховыя рэчывы.

Незаконная здабыча адной асобіны сома падчас забароны абыдзецца парушальнікам у 2 мільёны 520 тысяч рублёў (12 базавых велічынь). Акрамя таго, на іх будзе накладзены адміністрацыйны штраф — да 50 базавых велічынь. А ў выпадку, калі шкода ад нелегальнай рыбалкі складзе 100 і больш базавых велічынь, можа быць заведзена крымінальная справа.

## ТАВАРЫ ДЛЯ ДАЧНІКАЎ І АДПАЧЫВАЛЬНІКАЎ

**Летам Белкаапсаюз арганізуе выязны гандаль амаль у 200 месцах масавага адпачынку.**

З надыходам летняга сезона ён будзе весціся ў парках, скверах, на пляжах ля рэк, азёр, вадасховішчаў. Усяго будзе не менш як 186 пунктаў гандлю па ўсёй краіне, паведамілі ў Белкаапсаюзе. Акрамя гэтага, летам спажыўкааперацыя наладзіць гандлёвае абслугоўванне 3,7 тысячы дачных кааператываў і садоўніцкіх таварыстваў. Запланавана работа 153 сезонных стацыянарных крам, адпраўка дадатковых аўтакрам у 1,5 тысячы таварыстваў. Асноўнай задачай у сферы гандлю на бягучы год для Белкаапсаюза застанецца захаванне сваіх пазіцый у сельскай мясцовасці і нарошчванне прысутнасці ў гарадах. Прыярытэтам таксама будзе развіццё матэрыяльнай базы гандлю. Толькі за мінулы год на інвестпраекты гандлёвай галіны спажыўкааперацыі накіравана 249 мільярдаў рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## ДЗІЦЯ ВЫПАЛА З АКНА ВОСЬМАГА ПАВЕРХА

**З акна восьмага паверха дома па вуліцы Луцкай у Брэсце ў панядзелак выпала двухгадовае дзіця.**

Відавочцы здарэння, якія стаялі на аўтобусным прыпынку, выклікалі «хуткую дапамогу». Машына прыбыла за лічаныя хвіліны, і малога забралі. Ён быў жывы і моцна плакаў. Дзіця адвезлі ў абласную дзіцячую бальніцу і спрабавалі выратаваць, аперацыя доўжылася каля васьмі гадзін. Але, як паведамілі ў прэс-службе Брэсцкага абласнога УУС, ноччу хлопчык 2013 года нараджэння памёр. Паводле папярэдніх звестак, сям'я характарызуецца станоўча. Пакуль маці малога была на кухні, ён падцягнуў дзіцячае крэсла, адчыніў акно, не ўтрымаўся і выпаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

## АШУКАЛА ПРЫЯЦЕЛЯ НА 200 МЛН

**У сталіцы міліцыя затрымала жанчыну, якая махлярскім шляхам завалодала больш чым 200 мільёнамі рублёў.**

З верасня 2014 года па лістапад 2015-га 28-гадовая непрацуючая жыхарка Маладзечна вымантачыла гэтую суму ў пацярпелага, з якім была ў сяброўскіх стасунках. Яна пад распіску неаднойчы пазычала грошы, абяцаючы іх вярнуць. Да таго ж зламысніца папрасіла ў прыяцеля пакарыстацца яго планшэтам і мабільным тэлефонам. Малады чалавек і не здагадваўся, што дзяўчына не збіраецца яму нічога вяртаць. Калі доўг склаў больш за 210 мільёнаў рублёў, стаміўшыся чакаць, пацярпелы нарэшце звярнуўся ў міліцыю. Як паведамляе Фрунзенскі РУУС г. Мінска, затрыманай за махлярства ў асабліва буйным памеры пагражае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам да дзесяці гадоў. Раней дзяўчына прыцягвалася да крымінальнай адказнасці за аналагічныя злачынствы.

## НЕ ТОЙ БІЛЕТ ВЫЦЯГНУЛА

### Знаходка валюты скончылася крадзяжом

**Супрацоўнікі сталічнага крымінальнага вышуку ўстанавілі асобу жанчыны, якая ў адным з аддзяленняў банка забрала поліэтыленавы пакет з 6 тысячамі еўра, забыты іншым кліентам.**

— У міліцыю з заявай звярнуўся малады чалавек, які расказаў пра тое, як прыйшоў у аддзяленне банка памяняць валюту. Пры сабе ён меў чорны поліэтыленавы пакет з еўра. Памяняўшы частку грошай, наведвальнік выйшаў, пры гэтым той самы пакет застаўся ляжаць каля акенца касы. Калі спахапіўся і вярнуўся назад, прапажы на месцы ўжо не было, — расказала **прэс-афіцэр Цэнтральнага РУУС г. Мінска Таццяна АБОЗНАЯ**. — Праваахоўнікі ўстанавілі жанчыну, якая забрала пакет з грашыма. Гэта была 56-гадовая мінчанка, якая ў той дзень ішла ў бібліятэку вяртаць прачытаныя кнігі, а па дарозе вырашыла зайсці ў аддзяленне банка, каб купіць латарэйны білет. Жанчына заўважыла пакет каля акенца касіра і, калі набыла білет, падышла да яго і зазірнула ўсярэдзіну. Убачыла, што там ляжаць пачкі валюты, і забрала знаходку сабе. Заведзена крымінальная справа за крадзеж.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

---

■ Прыярытэты

# КУЛЬТУРА ЯК ФАКТАР БЯСПЕКІ

## Дзеячы культуры і мастацтва Беларусі адзначаны дыпломамі і ўзнагародамі Міністэрства абароны



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Традыцыйная сустрэча міністра абароны з прадстаўнікамі творчых саюзаў і арганізацый, а таксама прэзідыумам Рэспубліканскай камісіі па шэфстве работнікаў культуры і мастацтва над асабовым складам Узброеных Сіл адбылася ўчора ў Драматычным тэатры беларускай арміі.**

— Ва ўсе часы маральны дух людзей адыгрываў ключавую ролю ў забеспячэнні бяспекі, — звяртаючыся да прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі, адзначыў **міністр абароны Беларусі генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ**. — І ў сучасных умовах, калі менавіта свядомасць чалавека становіцца галоўным прадметам уздзеяння і ўрэгулявання, культура і мастацтва з'яўляюцца найважнейшымі фактарамі забеспячэння бяспекі. Важкую ролю ў захаванне святых традыцый уносяць армейскія творчыя калектывы, у тым ліку і лаўрэаты тэлевізійнага фестывалю армейскай песні «Звязда», установы культуры ваеннага ведамства.

Узгадаўшы мерапрыемствы па святкаванні 71-й гадавіны Перамогі ў Другой сусветнай вайне, кіраўнік сілавога ведамства адзначыў, што перамога ў той вайне — не толькі ваенная, але і духоўная. «І той гістарычны факт, што ў 1941 годзе Савецкі Саюз стаў самай чытаючай краінай у свеце, адыграў вырашальную ролю ў бітве з ворагам чалавецтва, — перакананы Андрэй Раўкоў. — Галоўным жа ўрокам мінулай вайны з'яўляецца тое, што нельга дапусціць паўтору трагедыі, неабходна ўсім магчымым арсеналам мер захаваць мір і стабільнасць. Гэты ўрок асабліва актуальны сёння, у год 75-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны».

Толькі сёлета пры непасрэдным удзеле ваенна-шэфскай камісіі быў рэалізаваны шэраг патрыятычных праектаў, якія заслужана атрымалі высокую ацэнку грамадства.

— Мы, творчыя людзі, добра разумеем, што без духоўнага здароўя грамадзян нашай краіны, асабовага складу Узброеных Сіл немагчыма забеспячэнне бяспекі Айчыны, — падкрэсліў **народны артыст СССР і Беларусі, старшыня Беларускага саюза кампазітараў, старшыня камісіі Ігар ЛУЧАНОК**. — Мы ўдзячны кіраўніцтву Міністэрства абароны за нязменную падтрымку традыцый высокай культуры, стварэнне неабходных умоў для арганізацыі працы творчых калектываў краіны, развіццё армейскіх устаноў культуры. Беларусь, напэўна, адзіная краіна ў свеце, дзе за апошнія 25 гадоў створаны армейскі тэатр.

Штогод на ваенную тэматыку з'яўляюцца новыя творы. Толькі летась мастацкі фонд студыі ваенных мастакоў папоўніўся новымі яркімі творцамі выяўленчага мастацтва. За мінулы год студыяй праведзена пяць тэматычных выставак у абласных і раённых цэнтрах краіны. Адметна, што да мастакоў-«старажылаў» далучаюцца маладыя аўтары. Сярод іх — Аляксандр Асядоўскі, работы якога «Вышыня» і «Непазбежнасць расплаты» папоўнілі скарбонку твораў на ваенную тэму. Як прызнаўся мастак, гэта яго дэбют. Дагэтуль у сваёй творчасці ён закранаў іншыя сферы жыцця. На далейшыя творы мастака натхніла начная пасадка самалётаў на аўтатрасу, на якой яму давялося папрысутнічаць.

Актыўна працуе і студыя ваенных пісьменнікаў. Яны рэгулярна выязджаюць у воінскія часці, выступаюць перад курсантамі Ваеннай акадэміі і вайсковых факультэтаў іншых ВНУ. І, вядома, з'яўляюцца новыя творы. Адзін толькі Вячаслаў Бандарэнка летась выдаў тры кнігі, на днях убачыла свет яшчэ адна. І ва ўсіх іх адзін лейтматыў — любоў да Айчыны, гістарычнага мінулага, павага да абаронцаў.

«Армія — усё маё жыццё, — гаворыць пісьменнік і тэлевядучы Вячаслаў Бандарэнка. — І ў гэтым ёсць нават парадокс, бо ў мяне няма ніякага воінскага звання і, па аб'ектыўных прычынах, у ваеннае вучылішча мяне не ўзялі. Тым не менш усе мае продкі з часоў Мікалая І былі афіцэрамі: бацька, дзед, прадзед і прапрадзед насілі пагоны палкоўніка. Ва ўсіх апошніх войнах, уключаючы падзеі ў Афганістане, мая сям'я ўдзельнічала. Таму тое, што я звярнуўся да ваеннай тэматыкі, абсалютна не дзіўна. Больш за тое, я абсалютна перакананы, што афіцэрскі корпус — гэта эліта грамадства».

— Што кіруе светам? Многія лічаць, што долар, нафта і газ, — адзначыў **начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Уладзімір МАКАРАЎ**. — І калі ім кажуць, што светам кіруе нематэрыяльнае, здзіўляюцца. Матэрыяльнае — сфера прагматыкі і статыстыкі. Што тычыцца душы і духоўных фактараў, то гэта сфера будучыні, сэнсаў, найвялікшых сімвалаў. Менавіта культура сцвярджае самыя высокія сэнсы. І беларуская армія сёння верная традыцыям высокай культуры.

Дарэчы, сярод узнагароджаных Міністэрствам абароны — і фотакарэспандэнт газеты «Звязда» Сяргей Нікановіч, творчасць якога ў выглядзе фотаздымкаў таксама ўплывае на выхаванне патрыятызму і любові да роднай зямлі.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by* ■

---

# ПАТРАБУЮЦЦА ПРАДАЎЦЫ... МЕТАЛАПРАКАТУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### Патрэбны працаголікі

Калі ўпэўнены, што можаце прадаць што заўгодна, наступныя прапановы якраз для вас. Швейцарская кампанія, якая распрацоўвае стаматалагічныя прэпараты, шукае медыцынскага прадстаўніка ў Мінску. Работнік будзе «з нуля» распаўсюджваць прадукцыю ў прафесійнай стаматалагічнай суполцы, праводзіць прэзентацыі і майстар-класы, удзельнічаць у спецыялізаваных выстаўках, ладзіць прома-акцыі. У дзень спецыялісту неабходна наведваць не менш за пяць стаматалагічных клінік (100 пунктаў за месяц)! Асноўныя патрабаванні — вышэйшая медыцынская адукацыя, вопыт працы медыцынскім прадстаўніком ад трох гадоў і веданне ключавых гульцоў «зубнога» рынку рэгіёна.

Аклад складае 500 долараў, але кампанія абяцае, што разам з працэнтамі ад продажаў будзеце мець усе пяць тысяч долараў. Бонус да фіксаванай часткі заробку, праўда, выплацяць толькі пры ўмове выканання плана. А сацыяльным пакетам (з медыцынскай страхоўкай і мабільнай сувяззю) забяспечаць з другога года працы. Калі затрымаецеся.

Іншы варыянт — паспрабаваць сябе ў гандлі металапракатам. З неабходных умоў выразна прапісаны толькі вопыт — 3-6 гадоў. У фірме папярэджваюць: патрэбны працаголікі. «Мы гатовы плаціць, калі вы гатовы працаваць», — пазначылі ў вакансіі. Менеджара абавяжуць шукаць кліентаў, складаць камерцыйныя прапановы, займацца аптовымі продажамі металапрадукцыі, весці дакументацыю. Прыбытак у 100 мільёнаў гарантуюць за кошт працэнтаў са здзелак.

Самую ж нечаканую прапанову з рэкордным заробкам мы знайшлі ў Брэсце. Вакансія з'явілася напрыканцы мінулага тыдня. Мясцовы наймальнік запрашае на працу 27 абліцоўшчыкаў-плітачнікаў. Плаціць абяцае 100 мільёнаў у месяц (у той час калі астатнія вакансіі па гэтай спецыяльнасці прапануюць ад 3 да 11 мільёнаў), бо на некаторыя заказы давядзецца ездзіць у Расію. Кандыдатам дастаткова мець агульную сярэднюю адукацыю і 4-5-ты разрад.



Фота Надзеі БУЖАН.

### Унікальныя кандыдаты

Высокааплатных вакансій на біржы зусім мала. Па падліках Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, доля прапаноў з заробкам у 10 мільёнаў і вышэй складае ўсяго адзін працэнт (у Мінску — тры працэнты). А месцаў, дзе гатовы плаціць у дзесяць разоў больш, і ўвогуле адзінкі.

— Такія вакансіі, хутчэй, выключэнне для сённяшняга рынку, — заўважае **дырэктар кадравага агенцтва Ірына ШАТКОЎСКАЯ.** — Калі яны і з'яўляюцца, то гэта, як правіла, месцы для кіраўнікоў і іншага топавага персаналу.

Ад суіскальнікаў, што прэтэндуюць на чатыры-пяць тысяч долараў у месяц, чакаюць рэдкіх кампетэнцый ці вопыту ў канкрэтнай вузкай сферы. Гэта той выпадак, калі веданне карэйскай мовы або ўменне працаваць за ткацкім станком (а лепш і першае, і другое разам) робяць вас унікальным кандыдатам, за якога гатовы плаціць.

Што да кампаній, якія могуць дазволіць сабе дарагіх ва ўсіх сэнсах работнікаў, то гэта звычайна замежныя фірмы і іх прадстаўніцтвы ў Беларусі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

---

# ДАПАМОГУ ПА БЕСПРАЦОЎІ ПЛАНУЕЦЦА ПАВЫСІЦЬ

**Прыйшоў час падумаць аб павышэнні дапамог па беспрацоўі, заявіў учора на «круглым стале» па абмеркаванні перспектыў укаранення новых відаў сацыяльнага страхавання, ініцыяваным Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі, начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТОКУН.**

Доўгі час у нашай краіне вакансій было больш чым работнікаў, як мінімум у 2-2,5 раза. Але сёння сітуацыя на рынку працы змянілася. Ідуць актыўныя працэсы мадэрнізацыі і структурызацыі прадпрыемстваў. Пры гэтым узрастае канкурэнцыя на рынку працы і вымушаная няпоўная занятасць.

— Мы працуем над праектам дакумента аб дыферэнцаваным павышэнні дапамог па беспрацоўі, — сказаў Алег Токун. Ён дадаў, што пакуль гаворка ідзе аб павышэнні дапамог выключна за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэту.

— Апошнім часам людзі звяртаюцца да мяне як да дэпутата з прапановамі павысіць памер дапамогі па беспрацоўі, — адзначыў і **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігар СТАНКЕВІЧ**. Парламентарый заявіў, што гэтае пытанне абмяркоўваецца ў дэпутацкім корпусе.

> **ДАРЭЧЫ**
>
> Колькасць зарэгістраваных беспрацоўных на 1 красавіка гэтага года склала 53,5 тыс. чалавек. Каэфіцыент напружанасці на рынку працы павялічыўся з 1,5 на 1 студзеня 2016 года да 1,83 беспрацоўных на адну вакансію на 1 красавіка 2016 года.

Дэпутаты ў тым ліку гатовы працаваць і над законапраектам аб страхаванні па беспрацоўі, які мог бы падтрымаць людзей, якія апынуліся без заробку. Дарэчы, над гэтым пытаннем цяпер актыўна працуюць у Мінпрацы і сацабароны. Страхаванне па беспрацоўі, як сцвярджаюць спецыялісты, здольнае змякчыць наступствы структурных змен у эканоміцы. Міжнародны вопыт сведчыць, што яно з'яўляецца дзейснай мерай абароны людзей, якія страцілі працу.

Апошнім часам адным з важных крокаў, які заклікаў палепшыць эканамічнае становішча беспрацоўных у Беларусі, стала падпісанне ў канцы 2015 года Генеральнага пагаднення паміж урадам, рэспубліканскімі аб'яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзаў. У дакуменце, у прыватнасці, гаворыцца аб неабходнасці павышэння памеру дапамогі па беспрацоўі да ўзроўню бюджэту пражытковага мінімуму.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

**P.S.** Больш падрабязна пра тое, што такое страхаванне па беспрацоўі, чытайце ў адным з наступных нумароў «Звязды».

---

# ШКОЛА Ў ШОКУ

## У сталіцы гімназіст параніў настаўніцу

**Па факце замаху на забойства педагога заведзена крымінальная справа.**

Як вынікае з афіцыйнай інфармацыі Следчага камітэта Беларусі, у панядзелак, 23 мая, а дзявятай гадзіне раніцы настаўніца адной з навучальных устаноў Кастрычніцкага раёна сталіцы набрала нумар сваёй дачкі і паведаміла пра тое, што адзін са старшакласнікаў толькі што нанёс ёй удар у шыю вострым прадметам. Пацярпелую жанчыну тэрмінова шпіталізавалі ў бальніцу, дзе ёй была аказана неабходная медыцынская дапамога...

Тым часам у сеціве пачалі абмяркоўвацца нібыта падрабязнасці жудаснага здарэння. Быццам бы настаўніцу трымалі чацвёра школьнікаў, прымушалі прасіць прабачэння за абразы навучэнцаў, выратаваць педагога спрабавалі калегі-настаўнікі... Як расказаў пазней **начальнік аддзела інфармацыі і сувязі з грамадскасцю Следчага камітэта Беларусі Сяргей КАБАКОВІЧ**, падазраваны ў злачынстве падлетак быў затрыманы, з ім пачалі працаваць следчыя. Па факце замаху на забойства жанчыны была заведзена крымінальная справа. У школе, на месцы здарэння, знаходзяцца спецыялісты, якія праводзяць неабходныя следчыя дзеянні, каб устанавіць усе падрабязнасці таго, што здарылася. Дапытвалі калег пацярпелай настаўніцы, а таксама вучняў.

У прыватнасці, прадстаўнік Следчага камітэта Беларусі цягам дня канстатаваў — педагог прыйшла ў прытомнасць. Паведамлялася, што стан жанчыны стабільна цяжкі... Сяргей Кабаковіч абверг інфармацыю, што настаўніцу нехта ўтрымліваў. «Падазраваны і пацярпелая знаходзіліся ў кабінеце ўдваіх». Пра першага было агучана, што хлопец вучыўся добра, выхоўваўся ў добрай сям'і, ні на якім уліку не стаяў. Следчыя шукалі прадмет, якім школьнік параніў педагога...

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ПАВЕТРАНЫЯ ХЛЕБАРОБЫ


Ан-2 пайшоў на ўзлёт.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Адчуванне, што стаіш на даху 17-павярховага дома. Лес, вёска, палі на выгляд хоць і цацачныя, але ўсё можна разгледзець. Раптам пазнаю тое самае поле, дзе ў жніўні брала інтэрв'ю ў аднаго з перадавікоў па нарыхтоўцы хлеба Уладзіміра Корсака. Яшчэ пару месяцаў — і яно зноў заззяе золатам каласоў. Вунь як дружна ўзышлі сёлета азімыя! З-пад крыла сыплецца на іх белым снегам мінеральная падкормка. Азотныя ўгнаенні і рэгулятары росту ўносяцца з разліку 170 кілаграмаў на гектар. Хто сказаў, што бітва за ўраджай пачынаецца ў жніўні? Яна ідзе ўжо сёння. Якім ён будзе сёлета, яшчэ рана загадваць. Але тое, што ў агракамбінаце дзеля гэтага робіцца ўсё і нават больш, пераканаліся на свае вочы. Авіягрупа «Зары» працуе сумленна, спяшаючыся ўкласціся ў строга вызначаныя тэрміны.

Не паспяваю ўвайсці ў смак, як «аннушка» паварочваецца ў паветры і ледзь не кладзецца на бок. У паніцы шукаю, за што б учапіцца. Сяргей Цімкоў супакойвае, спрабуючы перакрычаць роў машыны: не трэба хвалявацца, гэта мы разварочваемся, каб ляцець назад. Мы ідзём на пасадку, а напагатове стаіць ужо другі самалёт, які прымае эстафету. У лётчыкаў цяпер гарачая пара.

## ДАЛЯТАЎ ДА ОМСКА

Пакуль лётчыкі снедаюць (сваіх нябесных аратых гаспадарка забяспечвае гарачымі абедамі), гутарым з Віктарам Сасімам пра мінулае і надзённае малой авіяцыі. Яго лётны стаж складае 40 гадоў. І ўвесь гэты час ні разу не змяняў свайму Ан-2. А вось Сяргей Цімкоў да таго, як прыйсці ў сельскую гаспадарку, лятаў на Як-40, вазіў пасажыраў. Але гэта было яшчэ ў савецкія часы.

— Мы ўсе выхадцы з грамадзянскай авіяцыі СССР, — усміхаецца Віктар Сасім. — На гэтым маленькім самалёціку я асабіста далятаў да Омска. Летам адпраўляліся ў Казахстан, дзе вялікія пасевы. Там самая маленькая гаспадарка — 60 тысяч гектараў ворных зямель. І паспрабуйце без самалёта абысціся. Вось і працавалі да 2 месяцаў.


Віктар Сасім у малой авіяцыі ўжо 40 гадоў.

У «Зары» Віктар Сасім з 2005 года — моманту заснавання тут авіягрупы.

Прагрэсіўны метад прапанаваў тагачасны намеснік па раслінаводстве Алег Івашкевіч. Быў яшчэ добры прыклад суседзяў. З 2001 года авіяцыяй абзавялася крычаўская гаспадарка «Бель». І «Зара» вырашыла ўзяць прыклад. Два самалёты, якія дагэтуль тут працуюць, прыйшлі з Віцебскага авіяатрада.

— Яшчэ два ў аэрапорце «Магілёў» стаяць, — удакладняе лётчык. — Адзін хімсамалёт для выканання заказаў на баку, а другі — транспартны, каб вазіць пасажыраў.

— Якіх, калі не сакрэт?

— У асноўным прадстаўнікоў Магілёўскага аблвыканкама па маніторынгу сельгасугоддзяў. Зверху ўсе заганы як на далоні, на зямлі такога не ўбачыш. Будзеце ездзіць і не зразумееце, а падыміцеся на 100 метраў над зямлёй — і ўсё адкрыецца. У тым ліку і тое, што не датычыцца сельскай гаспадаркі.

Эканамічныя складанасці ўносяць свае карэктывы. На Магілёўшчыне было 3 гаспадаркі, якія мелі авіяцыю: «Зара», «Бель» і «Рассвет» імя Арлоўскага. У «Рассвеце» авіяцыя яшчэ крыху працуе, а вось «Бель» адмовілася, сёлета нават лётчыкаў звольнілі. «Зара» пакуль зацягвае пояс тужэй, але ад самалётаў пазбаўляцца не думае.

— А наколькі ад вашай працы залежыць ураджай? Вы ж, напэўна, з чымсьці параўноўваеце?

— А нічога не трэба параўноўваць. Гэта было апрабіравана ў Савецкім Саюзе. Працаваў Краснадарскі інстытут па прымяненні авіяцыі ў народнай гаспадарцы. Своечасова зробленая падкормка — 4 цэнтнеры плюс, своечасова праведзеная хімпраполка — яшчэ 4 і гэтак далей. А кошт збожжа кожны год павялічваецца. Усё акупляецца ў выніку.

Пра тое, што без паветранай хімапрацоўкі ўраджаю, вышэйшага за 60 цэнтнераў з гектара, дабіцца немагчыма, потым пацвердзіў і намеснік генеральнага дырэктара гаспадаркі па раслінаводстве Яўген Сялюгін.

## ЧЫРВОНАЯ ЗЯМЛЯ

Прашу прыгадаць самыя яскравыя выпадкі з працы, але Віктар Сасім толькі ўсміхаецца ў адказ: самы добры выпадак, калі нічога не здараецца. У гарачых кропках бываць не прыходзілася, а вось ліквідацыяй наступстваў чарнобыльскай аварыі займаліся. Пад радыяцыйным попелам аказалася ўся ўсходняя частка Магілёўскай вобласці.

— Існавала праграма ўнясення мінеральных угнаенняў у вялікай колькасці на забруджаных тэрыторыях — да 1000 кілаграмаў на гектар, — узгадвае лётчык. — Зямля практычна чырвоная была. Навукоўцы лічылі, што ўгнаенне звязвае радыенукліды, абясшкоджвае стронцый, цэзій. І мы працавалі вахтавым метадам па 10 дзён. З 1986 года, напэўна, гады два. А потым усё заглухла. Цяпер, калі ляціш над гэтым рэгіёнам, толькі па пладовых дрэвах разумееш, што там раней былі вёскі. У Касцюковіцкім, Чэрыкаўскім, Краснапольскім раёнах шмат такіх месцаў. Можна хвілін 8 ляцець — і ніводнага населенага пункта.

— А прыходзілася рызыкаваць?

— Галоўнае ў нашай працы — бяспека. Дзеля таго, каб не было здарэнняў, маецца цэлая брыгада тэхнікаў, інжынераў і іншай «прыслугі». Да таго, як самалёт узляціць, з яго зробяць ляльку. У нас у «Зары» 4 тэхработнікі абслугоўваюць рухавікі, яшчэ два — радыёэлектроннае абсталяванне.

— І тым не менш у навінах часам кажуць пра чарговую авіякатастрофу.

— Усе гэтыя катастрофы звязаны з тым, што пілоты цяпер лятаюць як аператары. Тэхналогія іх працы: націсне на гэтую кнопку, на гэтую. За ўсё адказвае бартавы камп'ютар. Калі ён выходзіць са строю, тады праблемы. Калі нас вучылі лятаць, такой разумнай тэхнікі на самалётах яшчэ не было. Мы спадзяваліся на свае рукі, вочы, адчуванні. Бяспека трымаецца на прафесіяналізме лётчыка. Калі чалавек 20 гадоў прасядзеў у самалёце, ён нават з заплюшчанымі вачамі будзе ведаць, што робіцца з машынай. На 50 метрах высакамер яшчэ паказвае вышыню, а калі ніжэй, вельмі вялікія хібнасці. На 5 метрах прыбор зусім не працуе. Спадзяванні толькі на вочы і рукі. Гэтаму нас вучылі. Сёння вучаць па-іншаму. Але гэта школа таксама апрабіравана.

## БЕЗ САМАЛЁТА

Праца для лётчыкаў «Зары» сёлета, лічы, скончана. Пасля падкормкі кукурузы — адпачынак амаль да наступнага года. Віктар Сасім вельмі перажывае, што з кожным годам у краіне становіцца менш магчымасцяў займацца любімай справай.

— Актыўныя прадпрыемствы, якія карыстаюцца малой авіяцыяй, засталіся толькі ў Гродне, — уздыхае ён. — Там знаходзіцца і вядучая кампанія па АН-2, і вядучае АТБ па абслугоўванні гэтых самалётаў. У Віцебску сельскай авіяцыі зусім няма. Там 6 самалётаў перадалі МНС, яны цяпер лясы патрулююць. А вось нашы гродзенскія калегі спачатку працуюць у сябе, а потым ляцяць у Расію, у Стаўраполле. У Расіі актыўна карыстаюцца самалётамі ў сельскай гаспадарцы. Краснадарскі, Стаўрапольскі край, Казахстан — гэта тыя вобласці, дзе шмат засеяных збожжавымі тэрыторый, якія патрабуюць апрацоўкі. Калісьці і мы там працавалі. Цяпер таксама маглі б. Але гэта вырашаецца не на нашым узроўні. Справа датычыцца Мінтранспарту і ўрадавых адносін.

— А што трэба, каб магілёўскі аэрапорт запрацаваў у поўную моц?

— Наш аэрапорт абмяжоўваецца тым, што прымае і адпраўляе самалёты. А дзеля таго, каб эксплуатаваць авіяцыйную тэхніку, трэба авіякампанія. У нас яна адна — «Белавія» — і абыходзіцца дзяржаве не танна. Да гэтых самалёцікаў (ківае на Аны) зараз наогул абыякавыя адносіны. Дзяржава не бачыць сэнсу ў развіцці малой авіяцыі. Усё трымаецца на нашым энтузіязме. Дзякуй, што яшчэ гаспадарка дае магчымасць ператвараць нашу мару ў жыццё. Мы ж апантаныя па сваёй натуры. Пасадзі нас у самалёт, і мы будзем бясплатна працаваць. Але ж чалавек павінен за сваю працу атрымліваць грошы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

### Каментар у тэму

— Авіяцыя — дарагое задавальненне, наземны транспарт таннейшы, але ад самалётаў мы не адмаўляемся, — кажа **генеральны дырэктар агракамбіната «Зара» Аляксандр КОРНЕЎ.** — Гэта дазваляе праводзіць работы больш аператыўна, у агратэхнічна сціслыя тэрміны. Урадлівасць збожжавых залежыць ад выканання тэхналогіі вырошчвання. І тут кожны прыём вельмі важны. Можна рабіць усё проста ўзорна, але калі адно звяно прапусціш, гэта ўсе намаганні звядзе на нішто. На жаль, цана высокая. Раней існавала кампенсацыя дзяржавы, цяпер яе няма. Усе выдаткі мы цалкам бяром на сябе.

Сёння сітуацыя ўсюды складаная. Але са сваёй задачай — карміць людзей — мы спраўляемся. За апошнія 5 гадоў увялі новы забойны цэх, зрабілі рэканструкцыю мясакамбіната, сушыльнай гаспадаркі, заканчваем рэканструкцыю камбікормавага завода. Тыя пытанні, якія мы перад сабой ставілі, вырашаюцца. Аб'ёмы вытворчасці за апошнія гады павялічыліся, працуем стабільна. «Зара» па-ранейшаму лічыцца валаўтваральным прадпрыемствам вобласці.

# САМЫЯ ХУТКІЯ, МОЦНЫЯ, ДАКЛАДНЫЯ

## На ваенным палігоне пад Брэстам спаборнічалі банкіры і праграмісты

**На палігоне 38-й гвардзейскай асобнай мабільнай брыгады праходзіць шмат спаборніцтваў, вучэнняў, у тым ліку міждзяржаўнага ўзроўню. А вось паказваць ваенна-спартыўнае майстэрства грамадзянскім асобам даводзіцца нячаста.**

— Тым большую адказнасць адчуваю, — сказала пра свой удзел у гульні супрацоўніца ААТ «Пріорбанк» Алена Уперавец. Гэта адзіная дзяўчына ў камандзе названай установы, якая страляла, бегала, пераадольвала паласу перашкод нароўні з мужчынамі. Яшчэ Алена аказвала медыцынскую дапамогу ўмоўнаму параненаму. Але пра гэта крыху пазней...



Ваенна-патрыятычная спартыўная гульня, якая адбылася ў мінулыя выхадныя пад Брэстам, атрымала назву «Супрацьстаянне» і нечым нагадала спаборніцтвы для школьнікаў «Зарніца». Толькі на гэты раз гулялі дарослыя людзі, таму заданні даваліся больш складаныя і патрабаванні да ўдзельнікаў былі адпаведна вышэйшыя.

У вайсковую часць прыбылі шэсць каманд з Мінска, якія прадстаўлялі банкі і IT-кампаніі. Паводле ўмоў, кожная каманда мела пяць спартсменаў-удзельнікаў і 15 чалавек групы падтрымкі. Апошнія, дарэчы, маглі не толькі падбадзёрваць гучнымі крыкамі сваіх калег, падносіць вадзічку спартсменам, але і ўдзельнічаць у розных спаборніцтвах і тым самым зарабляць дадатковыя балы для асноўнай каманды.

Претендент имеет право отозвать свое конкурсное предложение в любое время, но не позднее 5 (пяти) календарных дней до даты проведения заседания конкурсной комиссии по выбору победителя конкурса

**Срок, в течение которого организатор конкурса может реализовать свое право на отказ от проведения конкурса:** не позднее 5 (пяти) календарных дней до даты проведения заседания конкурсной комиссии по определению результатов предварительного квалификационного отбора претендентов.

**Дата, время и место заседания конкурсной комиссии по вскрытию конвертов с конкурсными предложениями с участием представителей претендентов:**

19 августа 2016 г. 10.00. Гомельский областной исполнительный комитет, г. Гомель, пр. Ленина, 2 (1 этаж зал заседаний)

Дата, время и место выбора победителя конкурса по выбору заказчика (застройщика) по строительству объекта.

**29 августа 2016 г. 10.00. Гомельский областной исполнительный комитет, г. Гомель, пр. Ленина, 2 (1 этаж, зал заседаний).**

**Претенденту, не победившему в конкурсе, возвращается задаток** в течение 5 (пяти) рабочих дней после подведения итогов по выбору победителя.

**Срок подписания договора на реализацию права строительства объекта, заключаемого по результатам конкурса:** не позднее 20 дней со дня утверждения протокола о выборе победителя конкурса. Существенные условия последующей сделки оговариваются в планируемом к заключению договоре на реализацию права строительства объекта.

**Возмещение затрат на организацию и проведение конкурса** (расходы по публикации извещений в средствах массовой информации, затрат на подготовку конкурсной документации и ее тиражирование, почтовые, канцелярские и другие расходы, предусмотренные законодательством) **осуществляется победителем конкурса** в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подведения результатов конкурса и до подписания договора на реализацию права на строительство объекта. Организатору конкурса представляются заверенные надлежащим образом копии платежных документов, подтверждающих возмещение расходов на организацию и проведение конкурса.

**Информация о проведении конкурса, в том числе перечень документов для предварительного квалификационного отбора, а также формы документов**, предоставляемых претендентами конкурса, размещена на официальном интернет-портале Гомельского облисполкома http://gomel-region.gov.by.

# ХТО ПРАЦУЕ З... ІСЦІНАЙ?

## Сацыёлагі пра тое, як не згубіцца ў інфармацыйным моры

**Ці не кожны дзень мы сустракаемся з рознымі апытаннямі. Сваё ўласнае «даследаванне грамадскай думкі» сёння можа здзейсніць любы, хто мае старонку ў сацыяльнай сетцы. Апытанні ладзіць для наведвальнікаў значная частка інтэрнэт-рэсурсаў, прынамсі, інфармацыйных ці інфармацыйна-забаўляльных. Часцяком гэтыя міні-даследаванні прыводзяцца журналістамі ў якасці абгрунтавання той ці іншай думкі — але ці правільна гэта? У «Звяздзе» прайшоў «круглы стол» на тэму: «Сацыялогія ў жыцці сучаснага грамадства», падчас якога тэарэтыкі і практыкі падзяліліся сваімі меркаваннямі аб тым, што можа, а што не мае права рабіць сацыёлаг, ці павінна сацыялогія даваць адпор «ілжэапытанням» і ці можа гэта навука прадухіліць канфлікт у грамадстве?**



Аляксандр ДАНІЛАЎ.



Таццяна ШЧОЛКАВА.



Алег КАБЯК.



Валерый БАРАДЗЕНЯ.



Дар'я НАЗАРАВА.



Ігар ПІНЧУК.



Андрэй БЯЛОЎ.



Святлана РАМАНАВА.



Ірына ЯКАЎЛЕВА.

Фота Надзеі БУЖАН.

**Каб абмеркаваць гэтыя праблемы, у рэдакцыю завіталі Аляксандр ДАНІЛАЎ, загадчык кафедры сацыялогіі факультэта філасофіі і сацыяльных навук Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі; Таццяна ШЧОЛКАВА, дацэнт кафедры сацыялогіі БДУ, кандыдат сацыялагічных навук; Алег КАБЯК, дактарант, дацэнт кафедры сацыялогіі факультэта філасофіі і сацыяльных навук Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта; Валерый БАРАДЗЕНЯ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, член Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах; Дар'я НАЗАРАВА, навуковы супрацоўнік Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі; Ігар ПІНЧУК, загадчык сектара збору і апрацоўкі сацыялагічных даных Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь; Андрэй БЯЛОЎ, загадчык аддзела Беларускага інстытута сістэмнага аналізу Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях; Святлана РАМАНАВА, загадчык кафедры эканамічнай сацыялогіі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, кандыдат сацыялагічных навук; Ірына ЯКАЎЛЕВА, кіраўнік сацыялагічнай лабараторыі Мінскага дзяржаўнага палаца дзяцей і моладзі.**

### Шклянка напалову поўная ці напалову пустая?

**Аляксандр ДАНІЛАЎ (А.Д.):**

— На аснове чаго вызначаецца статус, запатрабаванасць сацыялагічнай навукі? Перш за ўсё, на аснове яе функцый. Праца сацыёлага — гэта экспертыза таго, што адбываецца. Гэта першая рэч, якая безумоўна патрэбна і якая вызначае высокую запатрабаванасць гэтай навукі. Другі момант — гэта прагнозныя функцыі сацыялогіі. Яшчэ калі Агюст Конт (заснавальнік сацыялогіі. — **Аўт.**) вызначаў змест гэтай навукі, ён сказаў так: ведаць — каб прадбачыць, прадбачыць — каб рэгуляваць.

Сацыялогія нарадзілася ў сярэдзіне XIX стагоддзя. За гэты перыяд былі выпрацаваны і зафіксаваны канкрэтныя правілы работы і этычныя нормы. Яны і склалі кодэкс сацыёлага. Гэта добраахвотны спіс маральных і прафесійных правілаў, якія чалавек, што ўступае на прафесійную дарогу, прымае для сябе.

Я звярнуў бы ўвагу, што ў сваёй практычнай працы сацыёлаг павінен кіравацца высокім пачуццём сацыяльнай адказнасці, памятаць пра тое, што яго рэкамендацыі, вывады, дзеянні могуць аказаць істотны ўплыў на жыццё індывідаў, сацыяльных груп і грамадства ў цэлым. Ён павінен быць аб'ектыўным, арыентаваным на высокія прафесійныя стандарты.

Прафесійная сацыялагічная супольнасць невялікая. Мы добра ведаем адзін аднаго і стараемся, каб перш за ўсё, як і ў медыцыне, асноўным прынцыпам быў «не нашкодзь». Думаю, што рэалізацыя гэтага прынцыпу і дае дастатковы высокі статус гэтай навуцы. Сёння сацыялогія запатрабавана грамадствам.

**Алег КАБЯК (А.К.):**

— Сацыёлаг не павінен быць ангажыраваным. Сваім студэнтам я расказваю ў якасці прыкладу гісторыю часоў Міхаіла Гарбачова, калі на адным з пасяджэнняў сацыёлагі правялі экспрэс-апытанне, якое складалася з аднаго пытання: у якой меры вы падтрымліваеце пазіцыю Гарбачова, выказаную ў праграмным дакладзе? Былі атрыманы наступныя даныя: каля 30% сказалі, што цалкам падтрымліваюць, прыкладна столькі ж прызналіся, што цалкам не падтрымліваюць, а каля 40% адзначылі, што часткова падтрымліваюць, а часткова не падтрымліваюць. На наступны дзень у прапрэзідэнцкай газеце выйшла нататка: «Сацыёлагі правялі бліц-апытанне сярод дэпутатаў, якое паказала, што 70% дэпутатаў часткова або цалкам падтрымліваюць пазіцыю Міхаіла Гарбачова». Са спасылкай на тыя ж даныя і тое ж апытанне ў апазіцыйнай газеце нататка ўтрымлівала такі тэкст: «70% дэпутатаў часткова або цалкам не падтрымліваюць пазіцыю Гарбачова». Адны і тыя ж звесткі былі ўзяты ў якасці эмпірычнай базы, але ангажыраванасць як у першым, так і ў другім выпадку прывяла да супрацьлеглага выніку. Гэта адказ на пытанне, чаго не павінен рабіць сацыёлаг. Адны і тыя ж лічбы, тым больш вырваныя з кантэксту, можна інтэрпрэтаваць наадварот.

**Таццяна ШЧОЛКАВА (Т.Ш.):**

— Сацыёлаг абавязкова павінен праяўляць прафесійную кампетэнтнасць — гэта па-першае. Па-другое, любое сацыялагічнае даследаванне накіравана на атрыманне дакладнай інфармацыі аб вывучаемай з'яве або працэсе. Таму задача любога сацыёлага пры правядзенні сацыялагічных даследаванняў — імкнуцца да атрымання максімальна дакладнай і надзейнай інфармацыі і атрымання надзейных вывадаў з гэтай інфармацыі.

Натуральна, сацыёлаг павінен імкнуцца да ўстанаўлення навуковай ісціны. Гэта тое, дзеля чаго праводзіцца любое сацыялагічнае даследаванне.

Што да кодэкса сацыёлагаў, то, на маю думку, не прымаць яго — няправільна. Кодэкс з'яўляецца нарматыўнай асновай прафесійнай дзейнасці. Непрыняцце гэтага прафесійнага кодэкса цягне за сабой памылкі, парушэнні, утойванне нейкіх фактаў.

**А.Д.:**

— Адбываецца маніпуляцыя сацыялагічнымі данымі...

**Т.Ш.:**

— Прафесійны кодэкс усё гэта выключае, страхуе такім чынам і сацыёлага, і сацыялогію ў цэлым як навуку.

**Валерый БАРАДЗЕНЯ (В.Б.):**

— Калі ў заходніх краінах нехта не прыняў прафесійны кодэкс, не падпісаўся пад ім, таго выкідваюць з прафесійнай супольнасці, з ім ніхто не будзе заключаць ніякіх дамоўленасцяў. Нельга не пагадзіцца з тымі простымі і зразумелымі рэчамі, якія ёсць у кодэксе. Тое ж самае будзе адбывацца і ў нас. Прафесіяналы будуць аб'ядноўвацца, тыя, хто не будзе далучацца да прафесійнай супольнасці, застануцца на абочыне. Калі чалавек не прызнае прафесійны кодэкс, значыць, ён выкарыстоўвае навуку як шырму для дасягнення сваіх вузкіх патрэб. А гэта дыскрэдытуе навуку.

**Святлана РАМАНАВА (С.Р.):**

— З усёй адказнасцю скажу, што сацыёлагі яшчэ са студэнцкіх гадоў ахвотна прытрымліваюцца прынцыпаў кодэкса. У той жа час не заўсёды проста заставацца цалкам аб'ектыўным і незалежным даследчыкам. Той, хто заказвае даследаванне сацыёлагам, спачатку фарміруе нам заказ і расстаўляе акцэнты на тое, якога роду інфармацыя яму патрэбна на выхадзе, потым ён «забірае» вынікі, якія можа выкарыстаць дзе заўгодна. Гэтыя два моманты і з'яўляюцца самымі складанымі — гэта значыць, сацыёлаг адразу ставіцца ў пэўныя рамкі.

**А.Д.:**

— Сацыялагічныя даныя часцей за ўсё, калі праходзяць у маніторынгавым рэжыме, прадастаўляюцца для сферы кіравання. Ці можна прыняць правільнае кіраўнічае рашэнне або вырашыць канфліктную сітуацыю, калі ты атрымаў апрыёры цалкам ангажаваныя, загадзя запланаваныя звесткі? Натуральна, не.

**В.Б.:**

— Любая ўлада заўсёды зацікаўлена ў атрыманні аб'ектыўнай інфармацыі. Каб прыняць рашэнне, трэба ведаць рэальную сітуацыю.

### Навошта быць «сацыялагічна пісьменным»?

**«Звязда»:**

***— Які адказ можа даць сацыялогія як навука непрафесійным апытанням, якія падаюцца як сацыялагічныя даследаванні, што праводзяцца звычайнымі карыстальнікамі інтэрнэту?***

**В.Б.:**

— Навука ўвогуле не павінна ўмешвацца ў гэты працэс. Чалавек, які ўжывае такую інфармацыю, павінен звяртаць увагу на тое, што ён «ужывае». Сёння ў адкрытай інфармацыйнай прасторы можна «падсунуць» увогуле што заўгодна. Калі чалавек пісьменны, думае крытычна, то ён абавязкова паглядзіць крыніцу інфармацыі, як яна карэліруе з іншымі данымі — і толькі тады зробіць пэўны вывад. Афіцыйная навука — у гэтым выпадку сацыялогія — не абавязана рэагаваць на кожнае апытанне...

Людзі, напрыклад, з задавальненнем удзельнічаюць у апытаннях па вызначэнні тыпу характару або тэмпераменту... Патрэбна ім гэта — няхай сабе. Іншая справа, калі нейкія вынікі выкарыстоўваюцца, каб расхістаць сацыяльна-палітычную сітуацыю ў краіне, або напярэдадні выбараў «укідваюцца» правакацыі — тады неабходна даваць абгрунтаваныя вынікі сацыялагічных даследаванняў. Часцей за ўсё народ адчувае рэальную сітуацыю. Падмануць людзей не так проста.

**Т. Ш.:**

— Гэта з аднаго боку, тут я пагаджуся з вамі. З іншага, мне здаецца, на жаль, сёння ў нас недастатковы ўзровень сацыялагічнай пісьменнасці, і праблема ў гэтым ёсць.

**А. Д.:**

— Да таго ж, сёння прыходзяць новыя пакаленні кіраўнікоў, якія пагардліва ставяцца да любой сацыялагічнай інфармацыі: маўляў, я сам усё ведаю, мне нічога не патрэбна. Па сутнасці сацыялогія — навука аб жыццяздольнасці дзяржавы. Калі мы добра, па правілах працуем, то якраз і папярэджваем такім чынам крызісы, канфлікты, якія могуць узнікаць.

**Андрэй БЯЛОЎ (А.Б.):**

— Мы кажам пра тое, што насельніцтва, сутыкаючыся з сацыялагічнай інфармацыяй, не заўсёды ўспрымае яе патрэбным чынам. Але я хачу звярнуць увагу, што нашы чыноўнікі — гэта таксама насельніцтва, а як яны ўспрымаюць гэту інфармацыю? Для мяне гэта вялікая загадка.

Цяпер у нас ёсць і рэсурсы, і навыкі, каб праводзіць сацыялагічныя даследаванні. Іншая справа, як гэта пасля будуць успрымаць, як гэтым будуць карыстацца і на якім узроўні. Калі на прымітыўным узроўні, успрымаючы сацыялагічныя звесткі як звычайную інфармацыю, то, відаць, сацыялогія наўрад ці павысіць свой статус у параўнанні з цяперашнім станам, і, відаць, не зможа дапамагчы — нават калі ў кіраўніка ёсць адпаведная магчымасць. Таму трэба звярнуць увагу на сацыялагічную пісьменнасць тых людзей, якія выкарыстоўваюць або будуць выкарыстоўваць сацыялагічную інфармацыю. Ведаю, што, напрыклад, для Міністэрства працы і сацыяльнай абароны пастаянна праводзяцца рознага кшталту семінары па правядзенні дэмаграфічных даследаванняў. Мэтазгодна, на маю думку, распаўсюдзіць гэта на іншыя ведамствы, якія пастаянна працуюць з сацыялагічнымі данымі.

**А.Д.:**

— Складанасць наша заключаецца ў тым, што ў школе, напрыклад, пра сацыялогію ўвогуле не ідзе гутаркі. Але ж у тым, каб былі ўяўленні пра сацыялогію ў грамадстве, ёсць вялікая неабходнасць.

**Ірына ЯКАЎЛЕВА (І.Я.):**

— Я ганаруся, што мы змаглі стварыць і падтрымаць цэнтр сацыялагічных даследаванняў па праблемах моладзі ў Палацы дзяцей і моладзі. Калі завадская сацыялогія амаль знікла, то сацыялогія, якая вывучае праблемы моладзі на базе найбуйнейшага ў нашай краіне цэнтра моладзі, жывая і шукае новыя варыянты, формы свайго развіцця і прымянення.

Дадатковая адукацыя не мае стандартаў, абавязковасці наведвання, як гэта ёсць у школе. Туды прыходзяць, таму што гэта цікава і таму што жадаюць навучыцца нечаму такому, чаму не могуць навучыцца ў школе, нават ВНУ. Узнікае момант канкурэнтаздольнасці. Мы таксама зацікаўлены ў тым, каб ведаць, якія новыя межы ў сферы адукацыі сёння найбольш цікавыя. Дзякуючы ўласным сацыялагічным даследаванням мы ведаем жаданні, імкненні маладых людзей — так, дзве траціны школьнікаў старэйшых класаў збіраюцца выбраць прафесію, якая звязана з іх захапленнем. Такім чынам, мы можам выбудоўваць стратэгію сваіх адукацыйных прапаноў. Любое рашэнне ў рамках Палаца, якое накіравана на задавальненне патрэб нашых наведвальнікаў, базуецца на звестках нашай сацыялагічнай службы.

### Як рэагуюць улады?

**«Звязда»:**

***— Як прадастаўленыя сацыялагічныя даныя пасля ўплываюць на прыняцце кіраўніцкіх рашэнняў?***

**Дар'я НАЗАРАВА (Д.Н.):**

— У Інстытуце сацыялогіі мы праводзілі спецыяльныя даследаванні грамадскага меркавання па сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, над імі мы працавалі 4 гады. Даследаванні праводзіліся па наступных кірунках: адносіны да інавацый у сістэме тарыфаў на паслугі ЖКГ, энергазберажэнне, сарціроўка бытавых адходаў, ацэнка якасці паслуг ЖКГ па месцы жыхарства, арэнднае жыллё, форма абслугоўвання ў ЖКГ — дзяржаўная ці прыватная, прычыны, што перашкаджаюць развіццю прыватнай жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Мы аналізавалі, як да гэтага ставіцца не толькі насельніцтва ўсёй краіны, але і асобных рэгіёнаў, глядзелі, дзе якія праблемныя кропкі ёсць. Падчас падрыхтоўкі справаздачы па гэтай тэме мы таксама ўлічвалі даныя маніторынгаў, якія праводзяцца ў Інстытуце сацыялогіі ўжо даволі працяглы час, — на аснове іх у нас атрымалася 13 даследаванняў, вельмі цікавых.

На пытанне «якія праблемы хвалююць вас больш за ўсё?» пункт «праблемы тарыфаў на камунальныя паслугі» ў адказах рэспандэнтаў аказваўся на 4-м, 6-м або нават на 8 месцы. Гэта вельмі нізкі паказчык. На першым месцы, дарэчы, быў рост цэн на асноўныя прадукты, зарплата, часам — стан здароўя. Наступнае пытанне тычылася дастатковасці сродкаў на аплату камунальных паслуг. Людзей, якія сказалі, што ім хапае грошай на аплату ЖКГ, пераважная большасць. Па апошніх звестках, гэта 83,1%. Але гэта даныя яшчэ да павышэння тарыфаў.

Вынікі гэтых даследаванняў мы накіроўвалі ў Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў выглядзе разгорнутых аналітычных запісак-справаздач. Там усё прачыталі, нават паперы адпаведныя даслалі — маўляў, будуць выкарыстоўваць гэта для прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў. Не думаю, што на аснове нашых даследаванняў Міністэрства ЖКГ прыйшло да рашэння павысіць тарыфы на паслугі. Мы казалі, што павышаць рэзка тарыфы нельга. У прыклад прыводзілі Балгарыю, калі некалькі гадоў таму там рэзка павысілі адпаведныя цэны, людзі проста выйшлі з акцыямі пратэсту.

**В.Б:**

— Дарэчы, а даследаванні па тарыфах на мабільную сувязь ёсць? Яны ж нашмат вышэйшыя за тарыфы ЖКГ, але чамусьці хвалююць людзей менш. Мы кажам пра тарыфы на ЖКГ, але аказваецца, што пераважная частка нашага насельніцтва за мабільную сувязь плаціць больш, чым за водазабеспячэнне, водаадвядзенне, электрычнасць, газазабеспячэнне, цеплазабеспячэнне, вентыляцыю разам узятыя. Гэта нармальна, што за тэлефон мы плацім столькі без пытанняў і не параўноўваем гэтага з аплатай ЖКГ, якая, у адрозненне ад кампаній мабільных апаратаў, з'яўляецца велізарнай структурай?

**І.П.:**

— Вопыт паказвае, што часам пэўныя міністэрствы, ведамствы, праводзяць свае апытанні. Ведаю, што, напрыклад, Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства па падатках і зборах, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях праводзяць свае даследаванні. Гэта значыць, запыт на сацыялагічную інфармацыю ёсць, і ў кожнай структуры — свае інтарэсы. Калі гэта Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, то іх можа цікавіць, наколькі эфектыўныя іх інфармацыйныя кампаніі, наколькі людзі праінфармаваны пра іх мерапрыемствы.

Мы праводзім апытанні рэгулярна і тэматыка ў нас разнастайная — ад квартальных сацыяльна-палітычных даследаванняў да апытанняў моладзі. Вывучаецца і тэматыка сродкаў масавай інфармацыі. Гэта інфармацыя запатрабаваная, адпаведна, яна ўлічваецца пры прыняцці рашэнняў. Памятаеце, былі складанасці з рэцэптамі на лекі? Тады апытанні засведчылі, што ў людзей сапраўды ўзнікаюць праблемы. Тут спрацавалі нашы аператыўныя звесткі — і праблема знялася.

**С.Р.:**

— У нас зайшла гутарка пра прыняцце кіраўніцкіх рашэнняў. Але ж значная частка выпускнікоў-сацыёлагаў ідзе ў недзяржаўныя структуры. Для іх сацыялогія — гэта, перш за ўсё, не навука, а інструмент. Многія з іх нават не знаёмыя з кодэксам сацыёлагаў.

Камерцыйныя структуры сёння адна за адной ствараюць унутры сябе сацыялагічныя лабараторыі, даследчыцкія цэнтры. Яны імкнуцца распрацаваць больш гібкія інструменты вывучэння рынку.

Калі ўзяць у якасці прыкладу Заходнюю Еўропу, то там — дзясяткі тысяч сацыёлагаў, і ўсе яны працуюць, вядуць дастаткова актыўную даследчыцкую дзейнасць — праўда, лакалізаваную. Не на ўзроўні дзяржаўнай вертыкалі, міністэрстваў, ведамстваў — яны не бяруцца рашаць глабальныя пытанні. Даследчыцкая праца ідзе па структурах грамадзянскай супольнасці.

У нас, на жаль, сёння гэты сегмент сацыялагічнай працы развіты горш. У грамадскіх арганізацый, якія хочуць вывучаць праблемы, звязаныя з сацыяльнымі дэвіяцыямі, праблемамі асобных катэгорый насельніцтва, іншыя вельмі актуальныя пытанні, часта няма на гэта грошай. А, напрыклад, магутныя гандлёвыя прадпрыемствы, ігракі ІТ-індустрыі заказваюць маштабныя даследаванні або нават самі займаюцца даследчыцкай дзейнасцю, але вынік такіх даследаванняў — камерцыйная інфармацыя, якая актыўна выкарыстоўваецца, але не распаўсюджваецца. Сацыёлагі, якія працуюць у гэтай сферы, могуць шмат цікавага расказаць пра тое, як сацыялогія становіцца інструментам канкурэнцыі. А там, як вы ведаеце, усе сродкі добрыя.



**А.Б.:**

— Але і тут магчымыя навуковыя даследаванні. Трэба раздзяляць два моманты. Справа ў тым, што тэхналогія прыняцця кіраўніцкага рашэння, на маю думку, універсальная — і для камерцыйных структур, і для дзяржаўных. І, натуральна, яна заўсёды павінна абапірацца на якасную інфармацыю. Іншая справа, калі даныя сацыялагічных даследаванняў імкнуцца прадстаўляць у якасці рэкламы ўласнай кампаніі. Цяпер гэта вельмі распаўсюджана.

### На форумах сядзіць не так шмат людзей

**А.Б.:**

— Як усё-такі адрозніць навуковую сацыялогію, публікацыю, ад ненавуковай спробы агітацыі або прапаганды? Калі лічбы вырываюцца з кантэксту і не апісваецца тое, як яны былі атрыманы, няма апісання методыкі, значыць, звесткі не вартыя даверу. Па меншай меры можна даць проста спасылку на інтэрнэт-крыніцу: методыку даследавання можна, напрыклад, пачытаць на такім сайце. Вось так і трэба дзейнічаць, каб кожны спецыяліст, абывацель мог паглядзець, як рыхтавалася гэта апытанне.

**І. П.:**

— У гэтым плане СМІ часта грашаць такімі рэчамі. Ім важна прывабіць аўдыторыю, зрабіць яркі загаловак — каб на яго адгукнулася як мага больш чытачоў. Адпаведна з пэўнага масіву вынікаў апытання яны выбіраюць нейкую адну лічбу і кідаюць яе ў загаловак. У выніку чалавек успрымае гэтую інфармацыю як цалкам праўдзівую, хоць лічба часцей за ўсё вырвана з кантэксту.

**В.Б.:**

— «У два разы павялічылася колькасць злачынцаў у Н-скім раёне»... быў адзін, стала два.

Часта інтэрнэт, сацыяльныя сеткі выдаюцца за грамадскае меркаванне, і гэта вельмі непакоіць. Я шмат кантактую з людзьмі ў рэальнасці і бачу, што ў інтэрнэце носьбітам грамадскага меркавання выступае вельмі вузкі сегмент насельніцтва — і вельмі спецыфічны. Гэта тыя людзі, якія імкнуцца, каб іх убачылі, імкнуцца, што называецца, крыкнуць гучней. Многія ж, калі чытаюць водгукі на форумах, бачаць апытанні ў сацыяльных сетках, успрымаюць гэта за меркаванне большасці. Але ж на самых «раскручаных» форумах «сядзіць» 0,01% ад усяго насельніцтва — і гэта максімум. І то, гэта спецыфічнае насельніцтва, якое не мае нічога агульнага з рэпрэзентатыўнай выбаркай. Але ў выніку іншыя СМІ выкарыстоўваюць меркаванні гэтых удзельнікаў форуму, меркаванні інтэрнэт-апытанняў. І што мы бачым? Маленькая група людзей пачынае такім чынам уплываць на меркаванне ўсяго грамадства! Гэта асабліва заўважна, калі прымаюцца нейкія непапулярныя рашэнні — ці то павышэнне пенсійнага ўзросту, ці то павышэнне падаткаў...

### Даць магчымасць... паабедаць

**«Звязда»:**

***— Ці могуць сацыялагічныя даследаванні прадухіліць канфлікты ў грамадстве?***

**А.Б.:**

— Увесь вопыт эмпірычнай сацыялогіі накіраваны на тое, каб прадухіліць канфлікты. У свой час сацыёлагаў у ЗША хвалявала пытанне, якім чынам прымірыць людзей з розным этнічным паходжаннем, рознымі традыцыямі, культурнымі нормамі і інтарэсамі, якія жывуць у адным вялікім горадзе, — каб яны маглі мірна ўзаемадзейнічаць адзін з адным і кантактаваць. Менавіта ў гэтым кантэксце і зарадзілася эмпірычная сацыялогія. Таму калі казаць пра практычную мэту сацыялогіі, то яна першапачаткова задумвалася, як спосаб пераадолення канфліктаў. Калі яна перастане іграць гэтую ролю, то проста стане незапатрабаванай.

**Д.Н.:**

— Самі па сабе сацыялагічныя даследаванні не могуць неяк прадухіліць канфлікт. Галоўнае — гэта як выкарыстоўваюцца даныя сацыялагічных даследаванняў, напрыклад, органамі ўлады. Калі гэтыя сацыялагічныя даследаванні запатрабаваныя і на аснове іх прымаюцца рашэнні, то, безумоўна, гэта можа прадухіліць канфлікты ў грамадстве.

**Т.Ш.:**

— Адна з асноўных задач сацыялогіі — дыягностыка стану грамадства, але сучасны сацыёлаг не толькі дыягност, ён яшчэ і сацыяльны тэхнолаг. Ён выпрацоўвае тэхналогіі рашэння праблем. На маю думку, сацыялогія можа мінімізіраваць сацыяльныя канфлікты ў грамадстве.

**В.Б.:**

— Ва ўсім свеце расце праблема інфармацыйнага шуму. Сацыялогія дазваляе атрымліваць праўдзівую інфармацыю, неабходную для прыняцця канкрэтных рашэнняў. Трэба разумець, што сацыялогія — гэта сур'ёзная, магутная зброя і яе трэба выкарыстоўваць правільна. Я, відаць, пагаджуся, што і ў школе дзеці павінны ведаць пра сацыялогію.

**І.П.:**

— Яшчэ ў 50-я гады вядомы сацыёлаг Роберт Мертан вывеў паняцце «прароцтва, якое выконваецца само». Гэта калі нейкае лжывае перакананне ўплывала на ўстаноўкі людзей. Натуральна, гэтым імкнуцца маніпуляваць.

**А.Д.:**

— Вядомы сацыёлаг Піцірым Сарокін прыйшоў да высновы, што рэвалюцыі здзяйсняюць не галодныя людзі, а тыя, хто адзін раз не паабедаў. Сацыялогія падтрымлівае жыццяздольнасць грамадства і садзейнічае яго ўстойліваму развіццю без рэвалюцый і сацыяльных катастроф.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Даступравыя лекі

# ПАДЛІЧЫЦЬ І НЕ ПРАЛІЧЫЦЦА

## Фармацэўтычная прамысловасць пераходзіць на новую інавацыйную мадэль

**Навука, якая вывучае суадносіны паміж затратамі і эфектыўнасцю, бяспекай і якасцю жыцця пры розных схемах лячэння або прафілактыкі, называецца фармакаэканомікай. З пазіцыі ўрача, гэта не пошук найбольш танных лекавых сродкаў і апраўданне іх выкарыстання, а разлік затрат, неабходных для дасягнення пажаданай эфектыўнасці, суадносіны гэтых затрат з магчымасцямі. Такім чынам, фармакаэканоміка забяспечвае развіццё сацыяльна арыентаванай аховы здароўя, калі павышаецца даступнасць лекавых сродкаў і ўзмацняецца кантроль над затратамі пры правядзенні тэрапіі. Такая сістэма актыўна ўкараняецца ў Еўропе, Расіі, а цяпер і ў нас.**



Фота БЕЛТА.

Вось і на нядаўняй міжнароднай канферэнцыі «Фармакаэканоміка сацыяльна значных захворванняў» эксперты абмяркоўвалі неабходнасць пралічваць медыцыну, праблему замяшчэння імпартных лекаў для лячэння сацыяльна значных захворванняў.

Як адзначыў **намеснік дырэктара — начальнік упраўлення Дэпартамента фармацэўтычнай прамысловасці Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Віктар ШЭІН,** фармакаэканоміка дазваляе суаднесці затраты і эфектыўнасць, бяспеку і якасць жыцця пацыентаў пры розных схемах лячэння. Глабальным трэндам становіцца стварэнне мясцовых аналагаў. «На закупку лекавых сродкаў затрачваецца 4 працэнты ВУП краіны, таму ўласная вытворчасць азначае зніжэнне нагрузкі на бюджэт, — кажа Віктар Шэін. — Сёння доля беларускіх лекаў расце. Два-тры гады таму гэта было 35 працэнтаў, сёння — 50».

Лячэнне сацыяльна значных захворванняў (анкалогіі, туберкулёзу, бранхіяльнай астмы, цукровага дыябету і інш.) у нас бясплатнае. Павелічэнне колькасці мясцовых аналагаў наўпрост звязана з аказаннем дапамогі як мага большай колькасці сур'ёзна хворых — яны даступныя па кошце і не саступаюць па якасці.

— Цяжка сказаць канкрэтнымі лічбамі, колькі такі падыход, як фармакаэканоміка, здольны сэканоміць грошай. Калі мы адрасавалі гэта пытанне замежным калегам, каб атрымаць аргументы для пераканання нашай улады, яны адказалі, што і не лічылі, бо выгада відавочная, — кажа **генеральны дырэктар Цэнтра экспертызы і кантролю якасці медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Расійскай Федэрацыі Віталь АМЕЛЬЯНОЎСКІ.**

На думку **старшыні Наглядальнага савета Саюза «Медыцына і фармацэўтыка — інавацыйныя праекты», старшыні савета дырэктараў кампаніі NatiVita Аляксея СЫЧОВА,** у любой краіне павінен быць баланс паміж арыгінальнымі прэпаратамі і джэнерыкамі. Лячэнне аналагамі не саступае па эфектыўнасці, а можа каштаваць у 3 разы танней. Будучыня беларускай фармацэўтыкі — гэта развіццё па інвестыцыйна-інавацыйнай мадэлі. І ў гэтым працэсе вельмі важная роля належыць фундаментальным даследаванням. Створаны ў краіне фармацэўтычны кластар — прыклад супрацоўніцтва дзяржаўных навукова-адукацыйных устаноў, вытворцаў і іншых сэрвісных арганізацый. Словам, аб'яднанне намаганняў. У Расіі, напрыклад, працуе каля 15 кластараў рознай накіраванасці, іх работу рэгулююць 35 заканадаўчых федэральных актаў. У нас кластар адзін і заканадаўчая база адпаведная. Але з чагосьці трэба пачынаць.

Фармкластар «Саюз медыцынскіх, фармацэўтычных і навукова-адукацыйных арганізацый «Медыцына і фармацэўтыка — інавацыйныя праекты» быў створаны год таму ў Віцебскай вобласці. Яго асноўныя мэты — развіццё навуковага, тэхналагічнага і вытворчага патэнцыялу ў фармацэўтычнай галіне, фарміраванне сучаснай інфраструктуры для распрацоўкі імпартазамяшчальных і інавацыйных лекавых сродкаў. Такая кааперацыя дазваляе прыцягнуць знешніх інвестараў і атрымаць падтрымку дзяржавы за кошт інавацыйных фондаў такіх ініцыятыў. Адной з асноўных задач саюза з'яўляецца стварэнне праектнага цэнтра па падрыхтоўцы навукова абгрунтаваных і эканамічна эфектыўных праектаў, вырашэнне пытання іх фінансавання. Акрамя таго, некамерцыйнае партнёрства будуе сістэму падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў для фармацэўтычнай галіны.

У ліку першачарговых праектаў фармацэўтычнага кластара — стварэнне на базе Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта цэнтраў даклінічных, біяэквівалентных і клінічных даследаванняў, сучаснай навукова-даследчай лабараторыі кантролю якасці імунабіялагічных лекавых сродкаў. Гэта неабходна для стварэння інавацыйных прэпаратаў.

У склад кластара ўваходзіць і такая кампанія, як «НаціВіта», якая спецыялізуецца на высокатэхналагічнай вытворчасці першых генерычных лекавых сродкаў (аналагаў), уключаючы прэпараты для лячэння раку. Якасная фармпрадукцыя гэтага вытворцы паступае таксама ў краіны ЕС і СНД. Новы праект па вытворчасці онкапрэпаратаў каштуе 15 млн долараў. Да канца гэтага года будзе пабудаваны завод, дзе пачнецца выпуск інавацыйных прэпаратаў (са зменінай формулай, якая паляпшае якасць), біяаналагаў і джэнерыкаў для лячэння анкалагічных і іншых сацыяльна значных захворванняў. Выпуск па поўным цыкле пачнецца ў 2017-м ■

**Лекі ў Беларусі выпускае 31 прадпрыемства. Больш за 40 вытворчых участкаў 16 асноўных прадпрыемстваў маюць сертыфікаты GMP (адзіныя правілы Належнай вытворчай практыкі). Гэта робіць магчымым экспарт у 29 краін свету, у тым ліку ў ЗША, а сёння зацікаўленасць выказала, напрыклад, Саудаўская Аравія. За апошнія чатыры гады на ўнутраны рынак уведзена 537 новых айчынных лекавых сродкаў. Усяго зарэгістравана каля 1,5 тысячы лекаў айчыннай вытворчасці. З іх 82 найменні — арыгінальныя, астатнія — генерычныя. Пры гэтым асобныя прэпараты ў 2—4 разы таннейшыя за імпартныя аналагі.**

### Ходзяць чуткі, што...

### ...БЕЛАРУСКІЯ ЛЕКІ — ДОБРЫЯ

**Мала хто з нас ставіцца да айчынных лекавых прэпаратаў без скептыцызму. Назаляюць спецыялістам і журналісты — ну чаму трэба верыць, што наша таннае не горш за імпартнае? Тым больш, як ні спытаеш урача на прыёме, што лепш, дык «беларускае» далёка не ў першых шэрагах называецца. Вось што кажа на гэта намеснік дырэктара — начальнік упраўлення Дэпартамента фармацэўтычнай прамысловасці Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Віктар ШЭІН:**

**— Мы набываем субстанцыі толькі ў сусветна вядомых фірмаў, галоўным чынам Кітая і Індыі, а таксама некаторых еўрапейскіх краін. У Беларусі сёння зарэгістравана каля 6 тысяч лекавых сродкаў, і 1,5 тысячы з іх выпрацоўваюцца ў нас. Айчынны прэпарат, выраблены па поўным цыкле або хоць бы толькі расфасаваны ў нас, значна танней па кошце. Гэта адбываецца найперш з-за значна ніжэйшай рэнтабельнасці нашых лекаў у параўнанні з імпартнымі. Па некаторых пазіцыях рэнтабельнасць адрозніваецца ў дзясяткі разоў. Задача ў нас ставіцца — забяспечыць насельніцтва таннымі прэпаратамі, а не атрымаць максімальны прыбытак.**

# Краіна здароўя

Выпуск № 8 (361)

■ Сюрпрызы Венеры

# АСЦЯРОЖНЕЙ З АНТЫБІЁТЫКАМІ!

## Ці правільна лечаць інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам?

**Галоўны ўрач Англіі Салі Дэвіс не так даўно заявіла, што ганарэя можа стаць невылечным захворваннем, і папярэдзіла ўчастковых урачоў аб неабходнасці прапісваць належны курс лячэння ад гэтага захворвання. Прычынай папярэджвання стала ўспышка так званай супер-ганарэі ў горадзе Лідсе, што на поўначы Англіі. У сакавіку тут быў выяўлены рэзістэнтны штам гэтага захворвання, які не паддаецца лячэнню антыбіётыкам азітраміцынам (яго звычайна прапісваюць разам з іншым прэпаратам — цэфтрыяксонам).**

**Наогул лекі ў дадзеным выпадку павінны выкарыстоўвацца ў комплексе, але гэта адбываецца не заўсёды. Калі ж прымяняецца толькі адзін сродак, бактэрыям лягчэй выпрацаваць устойлівасць да лячэння. Выпадкі антымікробнай рэзістэнтнасці, няўдалага лячэння ганарэі расследуюцца.**

**Аб тым, ці ёсць пагроза ўзнікнення такой сітуацыі ў нашай краіне, расказвае дацэнт кафедры дэрматавенералогіі і касметалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук Ірына ШЫМАНСКАЯ.**



***— Англійскія медыкі маюць справу з невылечнай формай ганарэі?***

— Невылечных формаў ганарэі не існуе. Больш карэктна гаварыць пра фарміраванне менавіта рэзістэнтнасці, што звязана з нерацыянальнай антыбактэрыяльнай тэрапіяй, якая можа быць прызначана з прычыны не толькі самой ганарэі, але і нейкіх іншых бактэрыяльных інфекцый. У Вялікабрытаніі, ды і ў шэрагу іншых краін свету, даволі працяглы час прымяняліся аднаразовыя методыкі лячэння ганакокавай інфекцыі — гэта азначае, што пацыент прымаў адну таблетку або рабіў адну ін'екцыю. Дозы лекаў у такіх выпадках былі ў 2-4 разы ніжэйшыя за тыя, што прымяняюцца, напрыклад, у нас. Свае стандарты лячэння мы зацвярджалі пры ўдзеле замежных спецыялістаў яшчэ ў 2009 годзе, і ўжо тады было зразумела, што кароткія схемы і нізкія дазіроўкі прыводзяць да фарміравання рэзістэнтных формаў захворвання. Беларусь не пайшла па такім шляху, а прыняла ўдзел у вялікім міжнародным праекце, падтрыманым Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя, па маніторынгу антыбактэрыяльнай рэзістэнтнасці ганакокавай інфекцыі. Работа пачалася з супрацоўніцтва са шведскім бокам. Раз у год мы адпраўлялі і працягваем адпраўляць у Швецыю ўзоры ганакокавых культур для таго, каб высвятляць, ці няма ў бактэрыях храмасомных змяненняў, якія адказваюць за фарміраванне рэзістэнтных формаў. Рэферэнтны цэнтр на базе інстытута мікрабіялогіі таксама займаецца адсочваннем сітуацыі. Рэзістэнтнай ганакокавай інфекцыі ў нашай краіне няма. Больш-менш устойлівыя формы калі і з'яўляюцца, то да антыбіётыкаў, якія застаюцца ў безрэцэптурным водпуску, скажам, да тэтрацыклінаў.

***— Якія яшчэ палавыя інфекцыі лечацца антыбіётыкамі? У якіх выпадках размова можа ісці пра ўстойлівасць?***

— Найбольш распаўсюджаныя бактэрыяльныя інфекцыі — мікаплазмоз, хламідыёз, трыхаманіяз, бактэрыяльны вагіноз. Усё гэта лечыцца паводле стандарту, які пераглядаецца кожныя пяць гадоў. Аднак пакуль мы нічога не мянялі з 2009 года — дзеючыя пратаколы не страцілі сваёй актуальнасці. Рызыка развіцця ўстойлівасці да антыбіётыкаў захоўваецца ва ўсіх бактэрый. Таму што калі ў пацыента сфарміравалася рэзістэнтнасць да антыбіётыкаў адной групы (напрыклад, супрацьстафілакокавых), то існуе верагоднасць, што калі ён захварэе ганакокавай інфекцыяй, мікраарганізмы абмяняюцца гэтай інфармацыяй. Таму рэгулярны маніторынг вельмі важны, асабліва ў дачыненні да бактэрый, здольных часта мяняцца, прыстасоўвацца — як тая ж мікаплазма.

***— Ці праўда, што інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам, наогул дрэнна лечацца?***

— Гэта магло быць праўдай гадоў пятнаццаць таму, калі не існавала стандартнай дыягностыкі, мы карысталіся метадамі, якія не былі скіраваныя на выяўленне ДНК узбуджальніка — імунаферментным аналізам, рэакцыяй імунафлюарэсцэнцыі, — а гэта ўскосныя метады выяўлення інфекцый. Акрамя таго, антыбактэрыяльная тэрапія таксама не была стандартызаваная, і кожны ўрач рабіў прызначэнні зыходзячы з уласнага ўяўлення аб захворванні. Якасць лекавых прэпаратаў таксама была іншай. Сёння тэхнічная праблема дыягностыкі ліквідавана, прычым па ўсёй краіне. Паўсюдна ёсць магчымасць правядзення малекулярна-генетычнай дыягностыкі шляхам полімеразна-ланцуговай рэакцыі. Дыягназ, такім чынам, выстаўляецца на аснове вельмі дакладных метадаў даследавання. Нашы ўрачы маюць ужо добрае ўяўленне аб тым, як працуюць сучасныя антыбіётыкі. Цяпер самым важным застаецца адно — адсутнасць гэтай самай рэзістэнтнасці, або ўстойлівасці, бо калі яна сфарміруецца, то не дапаможа ні якасная дыягностыка, ні якаснае лячэнне.

***— Але і такім пацыентам ёсць магчымасць дапамагчы?***

— Калі ў пацыента сфарміраваўся храмасомны тып мутацый, які абумоўлівае антыбактэрыяльную ўстойлівасць, тады размова ідзе аб індывідуальным падборы антыбіётыкаў.

***— Колькасць выпадкаў палавых інфекцый расце ці зніжаецца?***

— Сумарная колькасць такіх інфекцый стабільна зніжаецца апошнія дзесяць гадоў да ўзроўню фактычна еўрапейскіх краін дзякуючы скаардынаваным намаганням. Вы, напэўна, ведаеце, што 1,5 працэнта беларускага насельніцтва перанесла сіфілітычную інфекцыю. Такі выбух адбыўся пасля распаду былога Саюза, аднак пастуова было шмат зроблена па пераасношчэнні, адаптацыі стандартаў лячэння, у абавязковым парадку пачалі здаваць аналіз на інфекцыі цяжарныя. Што датычыцца інфекцый, якія не з'яўляюцца класічнымі венерычнымі, напрыклад мікаплазмозу, бактэрыяльнага вагінозу, герпеснай інфекцыі 2 тыпу і некаторых іншых, то яны пакуль застаюцца досыць распаўсюджанымі. Актыўнасць іх залежыць ад стану імуннай сістэмы, наяўнасці эндакрыннай паталогіі, тактыкі лячэння палавых партнёраў ■

### Што такое ганарэя?

**Гэта захворванне, якое выклікае ўзбуджальнік Neisseria gonorrhoae.**

**Інфекцыя распаўсюджваецца пры вагінальным, аральным або анальным палавым кантакце. Суправаджаецца выдзяленнямі з палавых органаў, болем падчас мочаспускання, кровацячэннямі ў жанчын і іншымі сімптомамі. Часта нейкіх яўных сімптомаў можа і не быць, але пры гэтым інфекцыя будзе з лёгкасцю перадавацца. Нявылечаная ганарэя прыводзіць да бясплоднасці, запаленняў тазавых органаў і можа перадавацца дзіцяці падчас цяжарнасці.**

■ Смачна і карысна

# БОЛЬШ АГАРОДНІНЫ!

**Калі раптам на нейкі час вы пусцілі сваё харчаванне на самацёк, то спрабуйце вярнуць яго на здаровыя рэйкі.**

Ешце кашы, але не белыя, а грэцкую, аўсяную, ячную, яшчэ рыбу, гародніну, фрукты, зяленіва — любыя, якія можаце сабе дазволіць.

Дарэчы, пакуль яшчэ можна не захапляцца свежымі гароднінай і зяленівам — падыдуць і замарожаныя.

Вітаміны і мікраэлементы неабходны нам штодня, наесці іх пра запас немагчыма, так што вырашайце гэту задачу з адпаведнай перыядычнасцю. Хоць бы і з дапамогай полівітамінаў, якіх багата ў аптэцы.

Што да харчавання, то не забывайце пры гэтым усё, што магчыма, ужываць з лупінай.

Прыгатаваныя з гародніны салаты, вінегрэт ужывайце адразу, а не захоўвайце суткамі ў халадзільніку.

Не наразайце гародніну надта дробна. З гэтай прычыны ўжываць адвараную бульбу значна карысней, чым бульбяны суп.

Гатуйце гародніну на пары або запякайце.

Не замочвайце гародніну (калі гэта не зяленіва) перад гэтым у вадзе, каб не страціць вітаміны.

Назапашвайце энергію, ужываючы больш арэхаў і семак, а замест белага хлеба прывучайце сябе да хлеба з мукі грубага памолу і вотруб'я.

Каб не «забіць» вітаміны падчас захавання і гатавання, трымайце прадукты ў халадзільніку; не наразайце загадзя; апускайце ў ваду, калі тая ўжо закіпела; не перамешвайце надта часта; ужывайце адразу пасля гатавання.

**Урач-валеолаг Леанід МЯЛЕШКА** нагадвае, што недахват карысных рэчываў у арганізме можа шкодным чынам адбіцца і на нашым псіхічным здароўі, самаадчуванні. Няправільнае харчаванне — таксама стрэс для арганізма.



■ Антыстрэс

# ПАГЛЯДЗІ НА НЕБА, ПАЛІЧЫ ДА ДЗЕСЯЦІ

**Можна прывесці доўгі спіс сітуацый, здольных выклікаць стрэс, але наўрад ці ў гэтым ёсць такая вострая патрэба. Відавочна адно: амаль любая жыццёвая калізія, у якой чалавек адчувае напружанне, можа аказацца прычынай стрэсу.**



«Як мы ведаем, стрэс вельмі шкодны для нашага здароўя, — кажа **псіхолаг Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Вольга АКАТАВА.** — Таму проста неабходна вучыцца выходзіць з гэтага стану з мінімальнымі стратамі. Самае першае, што мы павінны засвоіць — нельга прымаць ніякіх рашэнняў і штосьці рабіць у стане перажывання моцнага стрэсу. А далей трэба мець на ўвазе няхітрыя спробы мінімізацыі шкодных наступстваў».

• Як бы банальна гэта ні прагучала, але спачатку палічыце да 10. Або павольна ўдыхніце і выдыхніце некалькі разоў.

Можна ўзяць на ўзбраенне яшчэ некалькі прыёмаў:

• Намачыце некалькі разоў халоднай вадой лоб, скроні і артэрыі на руках.

• Апішыце ў думках наваколле. Засяродзьце ўвагу на кожнай дробязі.

• Паглядзіце на неба. Сканцэнтруйцеся на тым, што бачыце.

• Павольна выпіце шклянку вады.

• Уявіце сябе ў садзе, на пляжы, у гарах.

• Прымяніце формулу заспакаення: «Сёння я не звяртаю ўвагі на дробязі».

• Калі вам хочацца смяяцца, плакаць, размаўляць — рабіце гэта. Можаце пабіць падушку.

• Наогул фізічная нагрузка выдатна дапамагае (20-30 прысяданняў, бег на месцы, хада па лесвіцы).

• Слухайце музыку, якая вас заспакойвае.

• Можаце заняцца чым-небудзь карысным — зрабіце прыборку, перастаноўку.

• Прыміце кантрасны душ.

• Займіце сябе чым-небудзь цікавым.

• Не пазбягайце размоў з прыемнымі людзьмі.

• Імкніцеся знаходзіць станоўчае нават у няўдачы («затое...»).

• Нарэшце, падумайце, ці можаце вы што-небудзь змяніць у сітуацыі, якая склалася. Калі не можаце... прыміце ўсё як ёсць.

• Думайце пра сябе і сваё здароўе.

• Сонца ёсць нават тады, калі неба зацягнутае хмарамі. ■

■ На прыёме ў псіхатэрапеўта

# ЧАГО БАІЦЦА ХВОРЫ НА ЦУКРОВЫ ДЫЯБЕТ?

**Цукровы дыябет мяняе лад жыцця чалавека — неабходна трымацца дыеты, прымаць прэпараты, займацца прафілактыкай ускладненняў. У такіх хворых могуць развівацца і псіхічныя расстройствы. Будзьце ўважлівымі да сябе ці сваіх блізкіх, калі яны пакутуюць ад цукровага дыябету. Размова можа ісці пра...**

...дэпрэсіўны сіндром, які праяўляецца зніжэннем настрою і актыўнасці, прыгнечанасцю, павышанай стамляльнасцю, трывогай, раздражнёнасцю, парушэннем сну;

...іпахондрыю, якая развіваецца на фоне цяжкіх унутраных адчуванняў і вегетасасудзістай нестабільнасці, а праяўляецца зацыкленасцю на праблеме здароўя, шматлікіх абследаваннях;

...фабічны сіндром — навязлівы страх смерці ад дыябетычнай комы, траўмы, інфаркту міякарда, ампутацыі канечнасцяў;

...парушэнне харчовых паводзінаў, што праяўляецца нервовай булііміяй і анарэксіяй і звязана з неабходнасцю вытрымліваць дыету, кантраляваць вагу;

...кагнітыўныя парушэнні — праблемы з памяццю і ўвагай.

Узнікае ў такіх хворых і шэраг псіхалагічных цяжкасцяў: іх палохаюць ускладненні і атрыманне інваліднасці, верагоднасць страціць работу ў выніку агучвання свайго дыягназу. Некаторыя адмаўляюць наяўнасць у сябе сур'ёзнага захворвання, што прыводзіць да ігнаравання схемы лячэння і пагаршэння стану.

— Пасля пастаноўкі дыягназу хвораму неабходна атрымаць як мага больш інфармацыі аб захворванні і прыцягнуць да рашэння праблемы блізкіх сваякоў, — тлумачыць **урач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Алена КОЯН.** — Далей неабходна супрацоўнічаць з урачом і выконваць усе яго рэкамендацыі. Псіхатэрапеўт можа дапамагчы адаптавацца да змен. Важнымі будуць і размовы са сваякамі, якія таксама перажываюць стрэс у сувязі з хваробай блізкага. Псіхічныя расстройствы можна карэкціраваць прыёмам псіхатропных прэпаратаў, у тым ліку антыдэпрэсантамі, досыць эфектыўнымі ў лячэнні дэпрэсіі, іпахондрыі, трывожных расстройстваў ■

**Матэрыялы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

# НЕСВИЖСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

## 28 июня 2016 года в 11.00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов:

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минская обл., г. Несвиж, ул. Гродненская, 35, к/н 624250100001004564 | 0,1380 | Возможность подключения электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения, канализации | 51 000 000 | 5 100 000 |
| 2 | Минская обл., г. Несвиж, ул. Достоевского, 46, к/н 624250100001004474 | 0,1167 | | 71 000 000 | 7 100 000 |
| 3 | Минская обл., Несвижский р-н, г.п. Городея, ул. Заречная, 18, к/н 624255700001001571 | 0,2500 | | 56 000 000 | 5 600 000 |
| 4 | Минская обл., Несвижский р-н, г.п. Городея, ул. Льнозаводская, 3, к/н 624255700001001570 | 0,1441 | | 39 000 000 | 3 900 000 |
| 5 | Минская обл., Несвижский р-н, г.п. Городея, ул. Льнозаводская, 12А, к/н 624255700001001569 | 0,1382 | | 38 000 000 | 3 800 000 |

Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по ул. Гродненской, 35 в г. Несвиже имеет ограничения в использовании на площади 0,0053 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 вольт.

Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по ул. Достоевского, 46 в г. Несвиже имеет ограничения в использовании на площади 0,0005 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 вольт.

Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по ул. Заречной, 18 в г.п. Городея Несвижского района имеет ограничения в использовании на площади 0,2500 га – водоохранная зона реки Городейка.

Условия для победителя аукциона: в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения; осуществить в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона государственную регистрацию перехода прав на земельный участок; получить в установленном порядке проектную документацию и разрешение на строительство жилого дома; снять на занимаемом земельном участке плодородный слой из-под пятен застройки и использовать его для улучшения плодородия усадебных земель; занять земельный участок (начать строительство) не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство жилого дома.

# НЕСВИЖСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

## 28 июня 2016 года в 11.00 проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков:

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерных сетей | Начальная цена, (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) | Срок аренды |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 6 | Минская обл., г. Несвиж, ул. Ленинская, к/н 624250100001004919, назначение – для строительства и обслуживания производственных зданий и сооружений, арендодатель – Несвижский районный исполнительный комитет | 1,0217 | Возможность подключения электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения, канализации | 549 762 700 | 55 000 000 | 51 год |
| 7 | Минская обл., г. Несвиж, ул. Сновская, к/н 624250100001004920, назначение – для строительства и обслуживания торговых и складских зданий, арендодатель – Несвижский районный исполнительный комитет | 0,6643 | Возможность подключения электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения | 513 243 700 | 51 500 000 | 51 год |
| 8 | Минская обл., г. Несвиж, ул. Косача, к/н 624250100001004576, назначение – для установки торгового павильона с остановочным навесом, арендодатель – Несвижский районный исполнительный комитет | 0,0055 | Возможность подключения электроснабжения | 1 199 223 | 120 000 | 20 лет |
| 9 | Минская область, г. Несвиж, пересечение улиц Некрасова и Кутузова, к/н 624250100001004806, назначение – для строительства и обслуживания магазина непродовольственных товаров, арендодатель – Несвижский районный исполнительный комитет | 0,2239 | Возможность подключения электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения | 139 960 600 | 14 000 000 | 50 лет |

Земельный участок для строительства и обслуживания производственных зданий и сооружений по ул. Ленинской в г. Несвиже имеет ограничения в использовании на площади 0,1710 га – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, на площади 0,0412 га – охранная зона объектов газораспределительной системы, на площади 0,0036 га – охранная зона сетей и сооружений канализации.

Земельный участок для строительства и обслуживания торговых и складских зданий по ул. Сновской в г. Несвиже имеет ограничения в использовании на площади 0,1447 га – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, на площади 0,0012 га – охранная зона объектов газораспределительной системы.

Земельный участок для строительства и обслуживания магазина непродовольственных товаров на пересечении улиц Некрасова и Кутузова в г. Несвиже имеет ограничения в использовании на площади 0,0022 га – охранная зона сетей и сооружений канализации.

Участник, ставший победителем аукциона, обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату за право заключения договора аренды земельного участка и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка и возникновением прав на него; не позднее 2-х рабочих дней после выполнения вышеуказанных действий заключить с райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить в течение двух месяцев со дня заключения договора аренды земельного участка государственную регистрацию прав на земельный участок; возвратить предоставленный в аренду земельный участок по минованию надобности (но не позднее срока, на который он предоставляется) в состав земель г. Несвижа в состоянии, пригодном для использования по назначению, или продлить в установленном порядке срок аренды на него.

Земельный участок для строительства и обслуживания производственных зданий и сооружений по ул. Ленинской в г. Несвиже предоставляется победителю с условиями:

получение в течение двух месяцев со дня государственной регистрации возникновения прав на земельный участок разрешения на проведение проектно-изыскательских работ;

осуществление разработки проекта на строительство производственных зданий и сооружений в срок в соответствии с нормами продолжительности проектирования со дня получения разрешения на проведение проектно-изыскательских работ (но не более десяти месяцев);

занятие земельного участка (начало строительства) не позднее шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство производственных зданий и сооружений;

осуществление благоустройства прилегающей территории, определенного архитектурными и строительными проектами.

Земельный участок для строительства и обслуживания торговых и складских зданий по ул. Сновской в г. Несвиже предоставляется победителю с условиями:

получение в течение двух месяцев со дня государственной регистрации возникновения прав на земельный участок разрешения на проведение проектно-изыскательских работ;

осуществление разработки проекта на строительство торговых и складских зданий в срок в соответствии с нормами продолжительности проектирования со дня получения разрешения на проведение проектно-изыскательских работ (но не более десяти месяцев);

